НЕ ЗАДЕРЖИВАЙ ГАЗЕТЫ

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся! Proletariusze wszystkich krajów, łączcie się! Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня. Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І САЛДАЦКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЯ ССР

АЎТОРАК 26 мая 1931 году № 118 (3206)

У бой за тэхнічны... культуры!

БССР зьяўляецца часткай лёнаводчай базы Савецкага саюзу. Шырокае разьвіцьцё лёнаводства і канапляводства ў БССР зьяўляецца важнейшай задачай, задачай якая вырашае стварэньне сыравінай базы для лёгкай прамысловасьці.

Дырэктывы партыі і ўраду аб вырашэньні праблемы тэхнічных культур на падставе сацыялістычнай рэканструкцыі селыскай гаспадаркі ускладаюць на партыйныя, савецкія, кааперацыйныя і гаспадарчыя арганізацыі рабочых, калгасьнікаў, бяднацка-серадняцкія масы вёскі БССР асабліва важную, асабліва адказную задачу.

БССР зараз уступае ў паласу масавай сяўбы тэхнічных культур. Калектывізацыя 30 проц. бяднацка-серадняцкіх гаспадарак БССР, разгортваемая праграма індустрыялізацыі лёнаводства і канапляводства шляхам арганізацыі ў 1931 г. 30-ці машынна-трактарных станцый, завозу 500 лёнацерабілак, разгорнутае мерапрыемства па будоўлі 43 новых і сканчэньні будаўніцтва двух заводаў для першапачатковай апрацоўкі лёну—усё гэта адчыняе перад сацыялістычным лёнаводствам і канапляводствам БССР вялізарнейшыя магчымасьці.

Для пашырэньня пасеву лёну і канаплі, павялічэньня ўраджайнасьці і поўнага выкананьня плянаў кантрактацыі тэхнічных культур—ЦК КП(б)Б і СНК БССР вызначылі цэлы рад важнейшых мерапрыемстваў, правядзеньне якіх у жыцьцё у поўнай меры забясьпечвае выкананьне тых задач, якія ўскладаюцца на БССР у галіне вырашэньня праблемы тэхнічных культур.

Перш за ўсё павінен быць поўнасьцю выкананы плян засеву лёну і канаплі ў 1931 годзе. Замест 150.000 га лёну ў 1930 г., ЦК КП(б)Б і СНК БССР вызначана цьвёрдая лічба засеву лёну ў 1931 г. у 240.000 га і канапель замест 21.961 га ў 1930 г.—у 40.000 га ў 1931 г. Лічбы гэтыя зьяўляюцца баявымі заданьнямі партыі і ўраду. Поўнае выкананьне і нават перавыкананьне плянаў сяўбы лёну і канаплі зьяўляецца справаю гонару і аднэй з важнейшых гаспадарча-палітычных задач для ўсіх партыйных, камсамольскіх, савецкіх, прафэсыйных, гаспадарчых, кааперацыйных арганізацый, усіх рабочых, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў БССР.

Але зараз мы ня маем яшчэ таго рашучага пералому, рашучага варуху ў рабоце адпаведных арганізацый па бальшавіцкаму выкананьню гэтай важнейшай дырэктывы партыі і ўраду. Больш таго, мы маем выпадкі, калі арганізацыі скарачаюць пасеўныя плошчы тэхнічных культур. За апошнія дні высьветлілася, што па 6 раёнах БССР плошча пасеву тэхнічных культур скарочана больш як на 5000 га. Так, Уваравіцкі раён скараціў плян пасеву лёну на 250 га і канапель на 308 га, Камарынскі раён скараціў плян пасеву лёну на 380 га, Менскі прыгарадны раён плошчу пасеву лёну скараціў на 280 га і канапель на 130 га. Усіх перагналі апартуністы з Касьцюковіцкага раёну, якія ня толькі зьнізілі плян засеву лёну на 3500 га, але напляваецькі аднесьліся да сыгналаў друку, напляваецькі аднесьліся да прапаноў Наркамзему БССР прыняць плян засеву тэхнічных культур. Апартуністычна аднесьліся да прыняцьця плянаў засеву тэхнічных культур і некаторыя лёнаканапляводчыя саўгасы БССР, якія скарацілі плян засеву лёну на 600 га і канапель на 1100 га. Ня гледзячы на катэгарычную дырэктыву Наркамзему БССР аб неадкладным прыняцьці пляну засеву, саўгасы яго ўсё-ж такі ня прынялі. Апартуністычна аднёсься Лёнаканапляводтрэст, які знаходзіцца ў Маскве. Ён даў дырэктыў саўгасам ня прымаць і ня выконваць пашыранага пляну засеву тэхнічных культур, вызначанага Наркамземам БССР.

Такія апартуністычныя адносіны да дырэктыў партыі і ўраду зьяўляюцца зусім недапушчальнымі. Трэба самым рашучым, самым бязьлітасным чынам ударыць па гэтых апартуністычных адносінах да вырашэньня праблем тэхнічных культур. Трэба пакласьці канец напляваецькім адносінам да выкананьня дырэктыў партыі і ўраду аб тэхнічных культурах.

Трэба безадкладна і рашуча ўдарыць па апартуністычнай практыцы паасобных раёнаў, саўгасаў і лёнаканапляводчых арганізацый. Пляны сяўбы другой бальшавіцкай, пляны сяўбы тэхнічных культур павінны быць выкананы поўнасьцю і ў тэрмін.

Для забясьпячэньня гэтага ЦК КП(б)Б і СНК БССР прапануюць правесьці рад важнейшых мерапрыемстваў. Перш за ўсё падвышаюцца на 30 проц. цэны на валакно, проса, салому, лён і канаплі для бягучай загатоўкі ўраджаю 1931 г. Аб гэтым павінна быць шырока абвешчана ўсім пасеўшчыкам і здатчыкам лёну і канапель.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР устанавіў цэлы рад ільгот калгасам і аднаасобным бяднацка-серадняцкім гаспадаркам, якія поўнасьцю выканаюць вытворчае заданьне па лёну і канаплі (не абкладаюцца адзіным сельгаспадаткам плошчы пад тэхнічнымі культурамі на землях новых раскарчовак, расчысткі і разводак, даходы ад пасеву лёну і канапель абкладаюцца ў палавінным разьмеры ў параўнаньні са збожжавымі культурамі, кантрактанты лёну і канапель забясьпечваюцца хлебам па пэўных нормах). Выканьня поўнасьцю вытворчае заданьне па лёну і канаплі забясьпечваюцца дадатковымі помысловымі таварамі і інш.).

Процант пасеву лёну і канапель у саўгасах Лёнаканапляводтрэсту павінен быць даведзен да 50, у калгасах раёну дзейнасьці МТС—да 30, ва ўсіх лёнаводчых калгасах—да 25. Улічваючы недахопы ўборачнай кампаніі мінулага году, ЦК КП(б)Б і СНК БССР асабліву ўвагу зварочваюць на падрыхтоўку і правядзеньне ўборачнай кампаніі, асабліва па тэхнічных культурах і кармох (рацыянальнае скарыстаньне рабочай сілы, шырокае разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва, зьдзельшчына і інш.). Цэлы рад важнейшых мерапрыемстваў павінен быць праведзен для забясьпячэньня своечасовай апрацоўкі лёну і канапель як у калгасах, так і ў аднаасобным сэктары. Цэлы рад мерапрыемстваў вызначан для павялічэньня ўраджайнасьці лёну і канапель.

Адозва ЦК КП(б)Б і СНК БССР павінна быць зараз-жа даведзена да шырачэйшых мас рабочых, калгасьнікаў. Яна павінна быць пакладзена ў аснову ўсёй практычнай работы па рэалізацыі пасеўных плянаў лёну і канапель гэтага году. Партыйныя, камсамольскія, савецкія, гаспадарчыя, прафэсыйныя і кааперацыйныя арганізацыі і шырокія масы калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў павінны зараз-жа разгарнуць вялізарную работу па выкананьні гэтых важнейшых дырэктыў партыі і ўраду, павінны выканаць тэрміны сяўбы лёну і канапель, вызначаныя ў пастанове ЦК КП(б)Б і СНК БССР, павінны зараз-жа ліквідаваць адставаньне па разгортваньні пасеўнай кампаніі і асабліва па тэхнічных культурах. Усе раённыя арганізацыі, саўгасы, калгасы, беднякі і сераднякі лёнаводчых раёнаў БССР павінны зараз-жа падхапіць адозву Заходняй і Ленінградзкай вобласьцяй, адозву нашае газэты аб усесаюзнай лёнавай пераклічцы, павінны разгарнуць шырокую хвалю сацспаборніцтва і ўдарніцтва, павінны разгарнуць бязьлітасную барацьбу з апартуністычнай недаацэнкай засеву лёну і канапель, рашуча змагаючыся з скарачэньнем плянаў засеву тэхнічных культур.

Трэба самым рашучым чынам зламаць спробы клясавага ворага сарваць пляны пацярпяўшага засеву тэхнічных культур. Трэба дабіцца поўнага і своечасовага выкананьня ўсіх мерапрыемстваў, вызначаных у пастанове ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб вырашэньні праблемы тэхнічных культур.

Гэтага патрабуюць задачы 3-га рашаючага году пяцігодкі.

Фашысцкі ўрад Польшчы ні граша ня даў пацярпеўшым ад паводкі ў Зах. Беларусі

Урад СССР асыгнаваў яшчэ 5 мільёнаў рублёў на дапамогу пацярпеўшым ад паводкі ў БССР

ПАСТАНОВА САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ САЮЗУ ССР АБ ДАПАМОЗЕ ПАЦЯРПЕЎШЫМ АД ПАВОДКІ Ў БЕЛАРУСКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ САВЕЦКАЙ РЭСПУБЛІЦЫ

Савет Народных камісараў Саюзу ССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

Асыгнаваць ў распараджэньне Савету народных камісараў Беларускай сацыялістычнай савецкай рэспублікі пяць (5) мільёнаў руб. з рэзэрвнага фонду Савету народных камісараў Саюзу ССР на дапамогу пацярпеўшым ад паводкі ў Беларускай сацыялістычнай савецкай рэспубліцы.

Старшыня Савету народных камісараў Саюзу ССР В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).

Кіраўнік справамі Савету народных камісараў Саюзу ССР П. КЕРЖАНЦАЎ.

Масква, Крэмль, 23 мая 1931 г. № 385.

***

Цэлыя вёскі і мястэчкі на Заходняй Беларусі былі затоплены вадою. Дзесяткі тысяч сем'яў рабочых, сялян, гарадзкой і местачковай беднаты апынуліся пад адкрытым небам, без кавалка хлеба і без прытулку. Згодна афіцыйных вестак у адным толькі віленскім ваяводзтве зьнесена вадой 2.738 будынкаў. У сапраўднасьці лічба значна перавышае ўрадавыя даныя.

Паводкай былі заліты рабочыя кварталы Вільні (Антопаль, Лукіская вуліца, Тартакі, Фабрычная вуліца, Заважная, Полацкая і г. д.). Ад паводкі пацярпела некалькі тысяч сем'яў рабочых і гарадзкой беднаты. Былі заліты вадой Слонім, Казяны, Дзісна, дзе звыш 9 тысяч жыхароў засталіся без прытулку. Друя—800 сем'яў. Шмат вёсак было заліта ў Сьвянцянскім, Маладэчанскім, Ашмянскім, Віленска-Троцкім, Навагрудзкім, Валожынскім, Гарадзенскім, Стаўпецкім і інш. паветах. Насельніцтва гэтых гарадоў, мястэчак і вёсак галадае, ня маючы ніякіх сродкаў да жыцьця, не атрымліваючы жадной дапамогі. У Заходняй Беларусі ў масавых разьмерах зьявілася эпідэмія брушнога тыфусу. Сотні дзяцей, сотні сем'яў гінуць ад кастлявай рукі голаду і галечы.

Што-ж зрабіў фашысцкі ўрад Польшчы, каб прысьці з дапамогай пацярпеўшым ад стыхіі—паводкі?

Фашысцкі ўрад Польшчы ніякай дапамогі пацярпеўшым не аказаў. Больш таго, маршал фашысцкага сэнату Рачкевіч, былы віленскі ваявода, адкрыта заявіў, што **«ўрад ня можа даць значнай дапамогі»**, а міністар працы і сацыяльнага забясьпячэньня Губіцкі заявіў **«разьмеры дзяржаўнай дапамогі будуць устаноўлены толькі пасьля грунтоўнага вывучэньня»**.

Як бачым, фашысцкі ўрад толькі думае «вывучаць» як паміраюць зруйнаваныя сем'і рабочых, сялян і гарадзкой беднаты. Фашысцкі ўрад думае толькі «вывучаць» разьмеры страт, але ня думае прысьці з рэальнай дапамогай.

Зьнішчаныя паводкай азімыя засевы бяднацка-серадняцкіх мас сялянства застаюцца не абсеянымі, зьнесены вадой будынак ня можа быць адбудаваным, бо беднякі і сераднякі ня маюць сродкаў купіць лесу.

Тысячы працоўных Заходняй Беларусі, пацярпеўшых ад паводкі, гінуць, пухнуць з голаду, фашысцкая зграя шумлівымі сказамі, хлусьлівымі абяцанкамі імкнецца стварыць ілюзіі, што нібы з часам пацярпеўшыя атрымаюць дапамогу. Чорная зграя—фабрыканты, абшарнікі, кэндзы, папы спэкулююць на голадзе і жабрацтве мас. Крывасмокты-эксплёататары ўсіх сілам імкнуцца не дапусьціць, каб рабочыя і працоўныя масы Польшчы арганізавалі дапамогу пацярпеўшым на Заходняй Беларусі.

Белы тэрор, масавыя пагромы, арышты, карныя экспэдыцыі—вось «дапамога» фашысцкай зграі, вось «дапамога» якую ўсімі мерамі падтрымліваюць беларускія нацыянал-фашысты. Буржуазія арганізуе дапамогу не для рабочых, не для бяднацка-серадняцкіх мас сялянства, а для беларускага кулацтва, для абшарнікаў, для буйных спэкулянтаў.

У фашысцкага ўраду няма сродкаў, каб дапамагчы пацярпеўшым, але ёсьць сродкі адбудоўваць стратэгічныя масты і дарогі, ёсьць сродкі на шалёнае ўзбройваньне, ёсьць сродкі на падрыхтоўку да новай імпэрыялістычнай бойні, на падрыхтоўку ўзброенага нападу на СССР.

У Савецкай Беларусі сёлета паасобныя раёны таксама пацярпелі ад паводкі. Пацярпеўшым неадкладна-ж была аказана шырокая арганізаваная дапамога. Урад БССР асыгнаваў усе неабходныя сродкі для пацярпеўшых. Было арганізавана шырокае грамадзкае харчаваньне, выдана неабходная колькасьць будаўнічых матэрыялаў бясплатна, для засеву саксаваных азімых палёў саўгасных, калгасных і бяднацка-серадняцкіх гаспадарак выдана звыш 493.750 пудоў насеньня. Ніводнага неадбудаванага будынку, ніводнага незасеянага гектара зямлі не застанецца ў Савецкай Беларусі.

Вялізарнейшую дапамогу пацярпеўшым ад паводкі БССР аказвае Саюзны ўрад. Сёньня мы друкуем пастанову СНК СССР аб асыгнаваньні **5 мільёнаў рублёў БССР для пацярпеўшых ад паводкі.** Гэта з надзвычайнай яскравасьцю сьведчыць аб моцы і непарушнасьці брацкага саюзу працоўных СССР. Гэта яшчэ раз сьцьвярджае правільную нацпалітыку ленінскай партыі. Гэта паказвае, што толькі дыктатура пралетарыяту, толькі савецкая ўлада зьнішчыўшы путы сацыяльнай і нацыянальнай няволі, зьнішчыўшы путы прыгнечаньня стварыла сапраўдны брацкі саюз працоўных, які забясьпечвае бурнае разьвіцьцё сацыялістычнага будаўніцтва і які ў кожную хвіліну ідзе на дапамогу працоўным Саюзных Рэспублік.

Няхай жыве камуністычная партыя, правадыр і арганізатар сацыялістычнага будаўніцтва!

Няхай расьце і мацнее саюз працоўных усяго сьвету!

Было 12—маем 35 пр. бядняцка - серадняцкіх гаспадарак

У Ціманаўскім сельсавеце Клімавіцкага раёну назіраецца вялікі зрух у калектывізацыі, які дасягнут дзякуючы шырокай растлумачальнай рабоце па папулярызацыі новага закону аб сельгаспадатку на 1931 год і фашэньняў VI зьезду саветаў.

Беднота і сераднякі цэлымі вёскамі пачалі аб'ядноўвацца ў калгасы. Так, пасёлак «Ясная Паляна» у ліку 15 гаспадарак цалкам далучыўся да калгасу імя «Дванаццатай гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі».

У в. Ціманава арганізаваўся новы калгас «Першамайскі», у які ўлілося звыш 40 бяднацка-серадняцкіх гаспадарак. У калгас «Дванаццатай гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі» акрамя пас. «Ясная Паляна» улілося яшчэ 10 бяднацка-серадняцкіх гаспадарак.

Наогул у сельсавеце за час падрыхтоўкі да вясны і пачатку сяўбы процант калектывізацыі павялічыўся з 12 да 35.

У калгасах уведзена зьдзельшчына і разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

М. Асмалоўскі.

Калгас імя Калініна павялічыўся ўдвая

Калгас імя Калініна, Артукоўскага сельсавету, Рэчыцкага раёну за час падрыхтоўкі да веснавой сяўбы павялічыўся ўдвая. Зараз у калгасе замест 100 бяднацка-серадняцкіх гаспадарак аб'яднана 200 гаспадарак, гэты калгас зьяўляецца самым буйным калгасам у Рэчыцкім раёне.

Калгасьнікі сваю штодзённую работу ўвязваюць з асноўнай задачай—калектывізацыяй. Калгасьнікі мяркуюць, што да канца сяўбы калгас павялічыцца яшчэ ўдвая, бо першы ўжо выехад калгасу ў поле даў прыліў 19 новых бяднацка-серадняцкіх гаспадарак, першамайскае сьвята—20 гаспадарак і пасьля першамайскіх сьвят, у выніку пасьляховага разгортваньня веснавой сяўбы, ў калгас уступіла яшчэ 20 новых бяднацка-серадняцкіх гаспадарак.

Калгас імя Калініна зьяўляецца самым прыкладам калгасам у раёне.

Нікмар.

***

У в. Вярхоўе, Коханаўскага раёну, у часе сяўбы арганізаваны новы калгас з 25 бяднацка-серадняцкіх гаспадарак. Па іншых вёсках створаны ініцыятыўныя групы.

Цішкоў.

***

У сувязі з пераходам калгасу «Чырвоная Зара», Коханаўскага раёну, на зьдзельшчыну прадукцыйнасьць працы калгасьнікаў павялічылася амаль удвайне. У калгасе добра наладзілі вучот работы. Калгасьнікі вельмі адабраюць зьдзельшчыну.

Васілеўскі.

Кітайская Чырвоная армія заняла рад новых гарадоў

Захоплена больш 1.000 палонных і шмат амуніцыі

ШАНХАЙ, 24. Агенцтва Рэйтэр з Ханькоў паведамляе, што пасьля заўзятай бойкі, якая працягвалася больш аднаго дню, чырвонаармейскія атрады заняла горад Гузн-Шань на поўдні правінцыі Хэнань, захапіўшы ў палон каля 1.000 салдат нанкінскай армії і захапіўшы шмат зброі і амуніцыі. Японская газэта «Шанхай Майніці» паведамляе, што чырвонаармейскія атрады захапілі гарады Гань, Аньфу і Ваньфу (на поўдні правінцыі Цзянсі), разьбіўшы дзьве дывізыі нанкінскіх войск.

Паводле паведамленьня карэспандэнта газэты «Чайна Прэс», чырвонаармейскія атрады правінцыі Цзянсі занялі горад Фынынісь і пагражаюць гораду Кэсань, на паўночным захадзе ад Наньчана. Паводле іншых зьвестак Чырвоныя арміі пагражаюць Наньчану (галоўны горад правінцыі Цзянсі).

Бастуючыя перамаглі

ПАРЫЖ, 21. Стачка с.-г. рабочых ў Цюіры (усходняя Прэнэя), узьнікшая 11 мая ў барацьбе за падвышэньне зарплаты, закончылася перамогай стачачнікаў. Прадпрыемцы прымушаны былі падвысіць зарплату гаспадарчым рабочым на 2 франкі ў дзень, а таксама задаволіць усе астатнія патрабаваньні рабочых.

Гаміданаўскія каты ўчыняюць пагромы

ПЭЙПІН, 24. Газэта «Цяньцзін Шы-Бао» паведамляе, што паліцыя ў Шанхаі ўтварыла рад налётаў на нелегальныя камуністычныя выданьні. Паводле слоў газэты, арыштавана звыш 200 камуністаў і захоплена шмат камуністычнай літаратуры.

Галадоўка палітвязьняў

ПЭЙПІН, 24. Газэта «Цзінь-Бао» паведамляе, што ўсе палітвязьні ў Цзянцзінскай турме абвясьцілі галадоўку ў знак пратэсту супроць зьверскіх адносін да іх.

Забастоўка ня зломлена

НЬЮ-ЁРК, 23-5. Паводле паведамленьня з штату Кентукі, там, у сувязі з падаўнімі сутычкамі паміж гарнякамі і паліцыяй арыштавана 13 чалавек, якім прад'яўлена абвінавачаньне ў забойстве. Некалькі тысяч гарнякоў працягваюць баставаць. Войска ўвесь час патруліруе. Увесь раён ахоплен забастоўкаю.

Фашысты-манархісты рыхтуюцца да „выгаднага моманту"

БЭРЛІН, 24-5. Паводле паведамленьня «Форвэртса» у Сілезіі адбылася канфэрэнцыя нацыянал-сацыялістаў (фашыстаў), На канфэрэнцыі прысутнічаў былы спадкаберца трону. Выступіўшы нацыянал-сацыялістычны (фашысцкі) дэпутат рэйхстагу Брукнер заявіў, што нацыянал-сацыялістычная партыя пляцамерна падрыхтоўвае адпаўленьне манархіі, стоячай над парляментам.

У выгадны момант нацыянал-сацыялісты публічна выступяць з гэтай праграмай. Неабходнай ступеньню да адпаўленьня манархіі будзе ўстанаўленьне рэгенцтва. «Рэгентам, як і манархам, можа стаць,—сказаў Брукнер,—толькі член Гогенцолернскага дому».

Тэрор супроць рэвалюцыйных рабочых узмацняецца

СТАКГОЛЬМ, 24-5 Паліцыя забараніла ў Стакгольме дэманстрацыю шведзкага камсамолу, саюзу чырвоных франтавікоў і рабочага спартыўнага саюзу.

Стачка правінцыі Хальсінгляд працягваецца. Рэфармістам удалося дабіцца, каб некалькі заводаў 26 мая зноў аднавілі работу.

Арышт сакратара саюзу рэвалюцыйных рабочых

ШАНХАЙ, 24-5. Газэта Шэнь-Бао» паведамляе, што шанхайская паліцыя арыштавала генэральнага сакратара саюзу рэвалюцыйных рабочых Тана.

ПЗШ дэманструюць сваю гатоўнасьць да вайны

НЬЮ-ЁРК, 24-5. У Нью-Ёрку адбылася дэманстрацыя вайскова-паветраных сіл. Над горадам і ваколіцамі ўтварылі палёты 597 вайсковых аэраплянаў. Паветраныя манэўры зьяўляюцца **часткаю дэманстрацыі гатоўнасьці ПАЗШ да вайны.** Гэта дэманстрацыя знайшла таксама свой выраз у пядаўніх манэўрах у Чынага і Дайтоне. Манэўры гэтыя каштавалі 3 мільёны даляраў. У панядзелак 25 мая адбудуцца манэўры ў Бастоне.

Сакрэтны даклад аб прымусовай працы

НЬЮ-ЁРК. («Нью-Ёрк» Гэральд Трыбюн» публікуе сакрэтны даклад аб прымусовай працы і працы зьняволеных. Даклад прадугледжвае неадпушчэньне ў Злучаныя Штаты фаду тавараў, вырабляемых прымусовай працай і працай зьняволеных. У ліку гэтых тавараў упамінаецца малайскі **каучук, тытун з бэльгійскага Конго, каучук з Бразыліі, Балівіі і Пэру, а** таксама рад імпартных тавараў афрыканскага і азіяцкага паходжаньня. Усіх гэтых пералічаных тавараў увоз якіх, паводле слоў дакладу, можа быць забаронен на падставе новага закону, які ўваходзіць у моц у канцы бягучага году, было ўвезена ў ПАЗШ у 28 годзе на суму ў 700 млн. даляраў.

У дакладзе не ўпамінаецца Савецкі Саюз і няма абвінавачваньня быццам савецкія экспартныя тавары выраблены пры дапамозе прымусовай працы або працы зьняволеных.

„На ратный подвиг"

«Ваша місія—мая місія. Будзьце супроць ворагаў хрысьціянства—бальшавікоў.

(Прамова папы польскай дэлегацыі. 3 газэт).

Міжнародная хроніка

⊙ У Моргантоўне (Заходняя Вірґінія) забаставалі 4000 гарнякоў у знак пратэсту супроць зьніжэньня зарплаты.

⊙ Ва ўсіх партарганізацыях нямецкай кампартыі праводзіцца шырокая справаздачная кампанія аб пастановах 11-га пленуму Выканкому Камінтэрну.

◆ **Абвешчан лёкаут 1.600 рабочых** мэталёзаводу «Карлсгютэ» у раёне Мараўскай Остравы (Чэхаславакія), з прычыны канфлікту паміж рабочымі і гаспадарамі з-за звальненьня звыш 400 рабочых, якіх фашысты патрабавалі прыняць назад.

◆ Камуністычная **«Базлер Форвэртс»** паведамляе, што ў Базэле арыштавана 12 італьянскіх рабочых. Газэта адзначае, што арышты ўтораны па патрабаваньні італьянскіх фашыстаў, якія знаходзяцца ў Швэйцарыі.

⊙ **Агенцтва Сівбун Рэнга** паведамляе, што зарплата рабочых Японіі на працягу красавіка ўвесь час зьмяншалася і была на 9,9 проц. ніжэй, чым у красавіку мінулага году.

⊙ Паводле паведамленьня **агенцтва Сівбун Рэнга, у Токіо (Японія)** арыштавана 20 студэнтаў «за распаўсюджваньне рэвалюцыйных ідэй і спробы арганізаваць забастоўку сярод студэнцтва у гадавіну камуністычных выступленьняў у Японіі».

⊙ **Як паведамляе агенцтва Гавас з Лісабона,** партугальскі ўрад атрымаў паведамленьне ад партугальскага кансула ў Дэдары (галоўны горад Сэнэгала, французская заходняя Афрыка) аб тым, што ўдзельнікі паўстаньня ў партугальскай Гвінеі капітуляваны.

◆ **Нафтавы трэст Сінклера** прыступае да скарачэньня ставак заработнай платы на 10 проц. Чакаюць зьніжэньня ставак у сталя-пісэрнай і інш. важнейшых галінах прамысловасьці.

ВАРШАВА. З прычыны правалу польска-літоўскіх перагавораў ў Жэнэве аб урэгуляваньні чыгуначных зносін паміж абедзьма краінамі, пытаньне перадана ў міжнародны гаагскі трыбунал.

Трэці дзень двухдэкадніка

Тэхніка сьвінагадоўлі—

ВУЗКАЕ МЕСЦА У ГАСПАДАРКАХ „СЬВІНАВОДУ"

Увядзеньнем прэміяльна-зьдзельнай аплаты, мабілізацыяй увагі ўсяго саўгаскага калектыву—дабіцца поўнага захаваньня маладняка

ЗАХАВАЦЬ МАЛАДНЯК

Рад саўгасаў «Сьвінаводу» ганебна зрываюць мерапрыемствы па сьвінагадоўлі. Адход маладняка вельмі значны, злучнай кампаніі не адводзіцца ніякай увагі.

У саўгасе **«Сталіна»** адход парасят дасягае 87 проц., **Ялова**—63 проц., **Негарэлае**—54 проц., **Новыя-Зялёнкі** — 52 проц., **Вішнёўка**—50 проц., **Боркі-Бялевічы**—47 проц.

У тых саўгасах, дзе адміністрацыя і рабочыя масы мабілізавалі сваю ўвагу на барацьбу за выкананьне прамфінпляну, дзе дагляд за сьвіньнямі пастаўлен належна—там мы маем адзавальняючыя вынікі работы: адход парасят сярэдні, злучная кампанія амаль поўнасьцю закончана.

У саўгасе **Вусьце** адход парасят складае 9,8 проц., **Цяцерына**—10,6 пр., **Халоўе**—11,6 проц., **Харамец**—11 проц., **Блонь**—11,9 проц., **Лемніца**—15,9 проц., **Пачаевічы**—17 проц., **Бранчыцы**—19 проц., **Высокае**—19 проц.

Поўнасьцю закончылі злучную кампанію: **Блонь, Палелюм, Мсьціж, Дрыбін, Калініна, Вэйна, Бранчыцы.**

Астаўшыя саўгасы павінны зараз-жа дабіцца лепшага дагляду сьвіней і парасят.

Сьвінаматка з поўным захаваным апа росам.

СЬВІСЛАЦКІ РВК СКАЖАЕ ДЫРЭКТЫВЫ

партыі і ўраду аб саўгасным будаўніцтве

У Сьвіслацкім раёне яшчэ ўзімку быў арганізаваны сьвінагадоўчы саўгас (Нобар). Пад гэты саўгас было вызначана 816 га зямлі. Яшчэ па сьнезе «Сьвінавод» прыступіў да арганізацыі гаспадаркі і падрыхтоўкі да веснавой сяўбы. За вельмі кароткі пэрыяд былі пабудаваны два дамы, стайня на 12 коняй, сьвінарнік, гэблня, выкапана студня на 12 колцаў. На гэтае будаўніцтва затрачана каля 50.000 руб.

У саўгас было завезена 23 коні, патрэбнае насеньне, трактар і інш. сельска-гаспадарчыя машыны. Але калі вышоў сьнег і трэба было прыступіць да сяўбы, дык аказалася, што з 816 га, адведзеных пад саўгас, свабодных толькі 113 га, а рэшту трэба яшчэ асвоіць. Мала таго, гэблня тут вельмі дрэнная, якая не дае магчымасьці арганізацыі высока-інтэнсыўнай гаспадаркі са значнымі пасевамі канюшыны і кораннеплодаў.

Няпрыгоднасьць адведзенай пад саўгас зямлі была ўстаноўлена спэцыяльнай камісіяй. Але РВК ня хоча прызнаць сваёй памылкі і працягвае сваю галаваціпскую палітыку — адводзіць саўгасу за 11 кілёмэтраў зямлю аднэй камуны ў Сялібскім сельсавеце (камуну, напэўна, РВК мае намер ліквідаваць).

Саўгасу трэба сеяць, трэба рыхтаваць кармовую базу, у саўгас занаряджана 350 імпортных сьвінаматак, але да апошняга часу ня высьветлена, дзе ён будзе сеяць і наогул яшчэ ня вырашаны і лёс самога саўгасу.

Гэтым пытаньнем павінны заняцца адпаведныя органы. Апартуністы павінны панесьці суровую кару.

Р.

ПРЫМУСІЦЬ СЬВІНАВОДТРЭСТ КІРАВАЦЬ САЎГАСАМІ

У Мсьціслаўскім раёне Сьвінаводтрэстам арганізуецца саўгас на плошчы каля 1½ тысячы га. Зямля саўгасу знаходзіцца ў трох кавалках, прыблізна па 500 га ў кожным. Саўгас ужо сёлета павінен значную плошчу асвоіць пад яравы клін.

Як-жа саўгас падрыхтаваўся да веснавой пасеўнай кампаніі? Надзвычайна дрэнна. Ёсьць рэальная пагроза, што значная колькасьць зямлі застанецца незасеянай. Справа ў тым, што арганізацыя саўгасу распачата толькі ў красавіку м-цы замест таго, каб гэтую работу правесьці значна раней. Саўгас, як гаспадарчая адзінка зацьверджан Сьвінаводтрэстам толькі 28 сакавіка.

Сьвінаводтрэст не аказвае ніякай дапамогі ў справе арганізацыі саўгасу. Каля в. Клін, Мазулаўскага сельсавету, пад саўгас адведзена плошча ў 500 га. Пад яравы клін трэба апрацаваць звыш 200 га. Сьвінаводтрэст пальцам не зварухнуў, каб стварыць умовы для пасьляховага правядзеньня веснавой пасеўнай кампаніі. Трэба зда быць цягавую сілу, а сродкаў няма. Нам. дырэктара саўгасу т. Райчанка закупіў 10 коняй без капейкі грошай: коні закуплены ў крэдыт. Корм для цягавай сілы, дошкі і іншыя рэчы, патрэбныя для гаспадаркі, таксама здабываюцца ў крэдыт.

Бюракраты з Сьвінаводтрэсту не дапамагаюць арганізацыі саўгасу. Характарнае зьявішча: саўгасу яшчэ ў сакавіку м-цы патрэбны былі сані для первазкі інвэнтара, кармоў, насеньня і г. д. Паслана рад тэлеграм з саўгасу ў Сьвінаводтрэст з просьбай паскорыць высылку саней. Сьвінаводтрэст на тэлеграмы зусім маўчаў, або ў лепшым выпадку адказваў—саней няма. Нарэшце, у пачатку мая сані былі прысланы, калі яны былі ўжо непатрэбны. Так справа стаяла і з калёсамі, апошнія атрыманы саўгасам толькі ў выніку націску адпаведных органаў на Сьвінаводтрэст.

Выпорчага пляну саўгас ня мае. Сьвінаводтрэст нават не пакланаіўся даць у саўгас апранома. Кіраўніцтва арганізацыяй саўгасу з боку Сьвінаводтрэсту адсутнічае. За ўвесь час арганізацыі саўгасу мэтэорам працаўсі інструктар Сьвінаводтрэсту, нічога не параіў, не дапамог і паехаў.

Саўгас ня мае інвэнтару, насеньне не пратручана, угнаеньне не дастаўлена, цягавай сілы зусім мала, рабочай сілы таксама нехапае. Памяшканьняў саўгас ня мае, а Сьвінаводтрэст спадзяецца на «авось», ды «нябось».

Сваёй цягавай сілай саўгас і паловы яравога кліну ня зможа апрацаваць. Трэба каб у апрацоўцы зямлі дапамагла саўгасу машына-трактарная станцыя, між тым апошняя адмаўляецца ад дапамогі, спасылаючыся на распараджэньне Трактарацэнтру, што МТС у першую чаргу павінна абслугоўваць калгасы. Вось у якім становішчы знаходзіцца саўгас.

Яшчэ адно характарнае зьявішча. Ня гледзячы на тое, што саўгас толькі што стаў арганізоўвацца, што ён яшчэ нічога ня мае, за выключэньнем зьмельнай плошчы, Сьвінаводтрэст хацеў гэтаму саўгасу ўжо зараз даць статак пародзістых сьвіней. Такія зьявішчы мяжуюцца проста са шкодніцтвам, бо ў сувязі з адоўтнасьцю кармоў сьвіньні здохлі-б. Аб становішчы саўгасу Сьвінаводтрэст нашэньня ведае.

Вывад. Так арганізоўваць саўгасы нельга. Бюракраты з Сьвінаводтрэсту за нядбайнасьць і галаваціпства ў справе арганізацыі саўгасу павінны быць прыцягнуты да суровай адказнасьці. Мсьціслаўскія раённыя арганізацыі і ўстановы павінны аказаць саўгасу ўсямернае садзейнічаньне ў справе засеву яравога кліну. Разам з гэтым трэба прымусіць Сьвінаводтрэст працаваць і кіраваць саўгасамі так, як гэтага патрабуюць нашы задачы сацыялістычнага будаўніцтва.

Мсьціслаў. Я. М.

ЦК КП(б)Б, СНКБ і ЦСПСБ

1-я Усебеларуская Канфэрэнцыя Пралетстуду Саюзу Лесдрэўрабочых скончыла сваю працу. Пад Вашым кіраўніцтвам намі прынята адпаведнае бальшавіцкае рашэньне, накіраванае на выкананьне дырэктыў Ленінскае партыі ў справе падрыхтоўкі пралетарскіх кадраў для лясной і дрэваапрацоўчай прамысловасьці БССР.

ПРЭЗЫДЫУМ 1-й УСЕБЕЛАРУСКАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ ПРАЛЕТСТУДУ ЛЕСДРЭЎРАБОЧЫХ.

Рыхтуемся да ўсебеларускага зьезду рабселькораў

МЕСЯЧНІК ДРУКУ—СУСТАЎНАЯ ЧАСТКА ПАДРЫХТОЎКІ ДА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА РАБСЕЛЬКОРАЎСКАГА ЗЬЕЗДУ

Прыклад ударнікаў калгасу „Ульянаўск" ператварыць ва ўсебеларускую пераклічку на лепшы ўдзел калгасаў у падрыхтоўцы да зьезду рабселькораў

Парт рганізацыі павінны рашуча і да канца рэалізаваць дырэктывы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б па пытаньні перабудовы нізавога друку і кіраўніцтва рабселькораўскім рухам

Месячніку друку—бальшавіцкія тэмпы

Месячнік друку—ударная і баявая палітычная кампанія.

Першая пяцідзёнка месячніку дала вялізарнейшы зрух у справе перабудовы рабселькораўскага руху і нізавога друку тварам да задач сацыялістычнага будаўніцтва. Гэты зрух знаходзіць свой выраз у тым, што рабселькораўская армія, нізавы і раённы партыйна-савецкі друк пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый па сапраўднаму пачалі перабудоўвацца на бальшавіцкія тэмпы.

Баявы лёзунг—«КОЖНЫ РАБСЕЛЬКОР-УДАРНІК, КОЖНЫ ЎДАРНІК-РАБСЕЛЬКОР» — знаходзіць СВАЁ ПРАКТЫЧНАЕ АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ.

Рабкоры, селькоры і юнкоры адзін за адным арганізуюцца ва ўдарныя брыгады друку, якія ўступаюць у сацспаборніцтва паміж сабой на лепшы ўдзел рабселькораў-ударнікаў у справе выкананьня задач партыі і ўраду. Калі да пачатку месячніку брыгады друку налічваліся дзесяткамі, дык зараз іх колькасьць пераваліла далёка за сотні. Асноўнай, цэнтральнай фігурай рабселькораўскага руху стаў УДАРНІК-РАБСЕЛЬКОР, а ўдарная брыгада стала вышэйшай формай удзелу рабселькораў у БАЛЬШАВІЦКІМ ДРУКУ.

На заклік менскіх ударнікаў «Правды» адказваюць раённыя газэты, шмат тыражкі, насьценгазэты, рабселькоры-ўдарнікі, вызначэньнем канкрэтных самаабавязацельстваў па перабудове рабселькораўскага руху і нізавога друку на новай аснове. Так, раённая газэта Аршанчыны «Ленінскі прызыў» у адказ на заклік менскіх ударнікаў вызначыла рад канкрэтных мерапрыемстваў па ўдзеле ў перабудове рабселькораўскага руху і нізавога друку. Заклік калгаснікаў-ударнікаў Крычаўшчыны знайшоў свой водгук сярод калгаснікаў Елышчыны. У адказ крычаўцам ударнікі калгасу «Ульянаўск» арганізавалі брыгаду імя «518» і ўступілі ў пераклічку з калгасам «Селькор». Гэты пачын ульянаўцаў павінен быць падхоплены ўсімі калгасамі БССР і ПЕРАТВОРАНЫ ВА ЎСЕБЕЛАРУСКУЮ ПЕРАКЛІЧКУ па пытаньні лепшага ўдзелу калгасаў у падрыхтоўцы да ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ РАБСЕЛЬКОРАЎ.

Але-ж побач са станоўчымі вынікамі, якія атрыманы за першую пяцідзёнку месячніка, мы маем рад буйных недахопаў. З месц ідуць трывожныя сыгналы. Месячнік друку не дайшоў да Старобінскага раёну. Аршанскі райкалгассаюз з усёй сваёй анартуністычнай ўпартасьцю не жадае належным чынам рэагаваць на рабселькораўскія допісы. Паасобныя партыйныя арганізацыі ігнаруюць дырэктывы партыі па пытаньні перабудовы рабселькораўскага руху і нізавога друку. Маюць месца і праявы «лявацкага» загібу, якія ідуць па лініі недаацэнкі работы рабселькораў-адзіночак. Ня ўся яшчэ грамадзкасьць уключылася ў месячнік друку. Асаблівы ў гэтай справе адстае раённы і сельскі савецкі апарат. Назіраецца зусім слабы ўдзел рабселькораў у перабудове савецкага апарату. З такімі недапушчальнымі зьявішчамі трэба раз і назаўсёды пакончыць.

25-га чэрвеня—Ўсебеларускі зьезд рабселькораў. Да пачатку Ўсебеларускага зьезду рабселькораў засталося 30 баявых дзён. Кожны дзень, які нас аддзяляе ад гэтай палітычнай даты, павінен быць запоўнен БАЯВОЙ ПАДРЫХТОЎКАЙ да зьезду рабселькораў, які ЗАВЯРШЫЦЬ СПРАВУ КАРЭННАЙ ПЕРАБУДОВЫ РАБСЕЛЬКОРАЎСКАГА РУХУ І НІЗАВОГА ДРУКУ БССР тварам да чарговых задач сацыялістычнага будаўніцтва. ПАРТЫЙНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ, якія нясуць непасрэдную адказнасьць за гэтую работу павінны ў поўнай меры РЭАЛІЗАВАЦЬ ДЫРЭКТЫВЫ ЦК УсеКП(б) і КП(б)Б па пытаньні рабселькораўскага руху і нізавога друку.

МЕСЯЧНІКУ ДРУКУ ТРЭБА НАДАЦЬ БАЛЬШАВІЦКІЯ ТЭМПЫ.

Наш адказ менскім ударнікам „Правды"

У адказ на адозву менскіх ударнікаў друку, якая была зьмешчана ў Менскіх газэтах, рэдакцыя Аршанскай раённай газэты «Ленінскі прызыў» узяла на сябе наступныя абавязацельствы:

1. Арганізаваць рабкораўскі семінар на Аршанскім чыгуначным вузьле забясьпечыць яго кіраўніцтва работнікамі рэдакцыі, таксама рабкораўскія гурткі пры Ільянным і Мясным камбінатах.

2. Арганізаваць двухтыднёвыя курсы для старшынь рэдкалегій насьценгазэт чыгункі і прадпрыемстваў і дэкадныя курсы ў адным з буйнейшых саўгасаў, для падрыхтоўкі старшынь рэдкалегій для групы саўгасаў і калгасаў.

3. У парадку выкананьня дырэктыў ЦК УсеКП(б) аб дыферэнцыяцыі кіраўніцтва рабселькораўскім рухам, бярэм на сябе абавязак распрацоўкі спэцыфікацыі работы нізавога друку і рабкораў чыгункі, прадпрыемстваў і селькораў (саўгасаў і калгасаў).

4. Арганізаваць на старонках газэты «Ленінскі прызыў» сыстэматычны агляд шматтыражак і насьценгазэт прадпрыемстваў, саўгасаў і калгасаў.

5. Узяць шэфства над шматтыражкамі, Ільнакамбінату і саўгасу Межава.

6. Падрыхтаваць аднаго рабкора с прадпрыемства, альбо селькора з калгасу для сталай работы ў рэдакцыі газэты «Ленінскі прызыў».

Месячнік друку не дайшоў

да Старобінскага раёну

Пастанова ЦК КП(б)Б аб перабудове рабселькораўскага руху, аб самаправерцы нізавога друку і перабудове партыйнай ячэйкай, Старобінскага раёну, ня выконваецца.

Парт'ячэйкі Старобіншчыны лічуць, што ў часе сяўбы можна і не займацца работай з рабселькорамі і нізавым друкам.

Насьценгазэтамі парт'ячэйкі ня кіруюць. Напрыклад, Чырвонаградкаўская ячэйка ня толькі ня кіруе насьценгазэтамі, якія маюцца на тэрыторыі сельсавету, але нават ня ведае пры якіх установах і арганізацыях яны існуюць.

А вось яшчэ факт. Старшыня калгасу «Чырвоны Хлебароб» Гого М. зьяўляецца сябрам рэдкалегіі. Калі т. Гого было задана пытаньне аб тым, як наладжана работа насьценгазэт, дык апошні адказаў, што «газэта ўсё роўна нічога не дапамагае».

Ёсьць асобныя партыйцы, якія замест дапамогі ў справе наладжваньня работы насьценгазэт, займаюцца такім разважаньнем, «што наладжваць работу насьценгазэт патрэбна ў зімовы пэрыяд, як больш «свабодны» час».

Партыйныя ячэйкі Старобінскага раёну павінны перабудаваць сваю работу ў галіне кіраўніцтва рабселькораўскім рухам у адпаведнасьці з рашэньнямі партыі ў самы бліжэйшы час.

Месячнік друку пачаўся, але партыйныя ячэйкі аб ім амаль нічога ня ведаюць. Райком партыі павінен даць жорсткія дырэктывы парт'ячэйкам аб узмацненьні і пашырэньні нізавога друку, аб узмацненьні кіраўніцтва рабселькораўскім рухам.

Брыгадзір «С. Б.»: Грышка Шчавель.

„Селькораўцы" прымайце заклік „Ульянаўцаў"

Рапарт ударнай селькораўскай брыгады калгасу „Ульянаўск" імя 518

Мы, ўдарная брыгада імя «518» калгасу «Ульянаўск» Санюкоўскага сельсавету рапартуем партыі і ўраду аб выкананьні ускладзеных на наш калгас задач. Мы горача прынялі рапарт крычаўцаў, які падліў бадзерасьці і энтузіязму ў нашу работу.

Па прыкладу крычаўцаў мы па бальшавіцку змагаемся за поўнае выкананьне і перавыкананьне плянаў другой бальшавіцкай. Мы справіліся з ускладзенымі на нас задачамі, выканаўшы заданьне па сяўбе аўса, ячменя, лёну на 110 проц. Зараз заканчваем сяўбу бульбы і сілясных культур.

Пасеў плошча нашага калгасу ў параўнаньні з мінулым годам павячылася ў два разы. Наш калгас не вялікі, але выконвае вялікія задачы ў 5 гадовым пляне. Мы сваімі сіламі без дапамогі дзяржавы будуем скотны двор, стайню і кароўнік на 70 галоў. Гэтая работа праводзіцца адначасова з выкананьнем плянаў пасеўкампаніі. Мы добра наладзілі нашы узаемаадносіны з аднаасобнікамі беднатой і сераднякамі—заўтрашнімі калгаснікамі і яны дапамаглі ў работе нашаму калгасу.

У выніку бальшавіцкай работы нашага калгасу мы дабіліся значнага прыліву бядняцка-серадняцкіх гаспадарак мы ўступілі ў пасеўкампанію з 9 гаспадаркамі, а зараз маем 19 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Раней мы мелі параўнальна нізкія нормы выпрацоўкі: 0,3 га работу на плуг у дзень, а зараз—0,5—0,75 га. Выхад на работу—100 процантны, работа праводзіцца па-ўдарнаму. Перайшоўшы на зьдзельшчыну мы ліквідавалі недахопы і перабоі ў рабоце. Зараз на аснове супольнай зьдзельшчыны мы ліквідуем абязьлічку.

Побач з нашым калгасам знаходзіцца калгас «Селькор» (в. Палаўкі). Мы далучыліся аб тым, што там работа ідзе горш таму, што ў калгас залезьлі заможнікі і нават кулакі. Кулак Мельчанка Піліп нават пралез у кіраўніцтва калгасу, але ён і да гэтага часу яшчэ нічога неабагуліў, разбазарыў сваю маёмасьць і фіктыўна падзяліўся са сваім цесьцям таксама кулаком. Мельчанка не ўдзельнічае ў рабоце калгасу, а работае на сваёй гаспадарцы і тэта разлагае калгаснікаў. Бядната ў гэтым калгасе знаходзіцца ў загоне і ня можна нічога зрабіць з кулаком Мельчанкам. У выніку гэтага калгас ня мае росту, пляны сяўбы ў калгасе зрываюцца.

Мы зьвяртаемся да калгаснікаў—«селькораўцаў».

Таварышы! Пасьледуйце нашаму прыкладу ў рабоце. Давайце ударныя тэмпы работы. Ганіце вон з калгасу заможнікаў і кулакоў.

Вы носіце назву селькора, які павінен быць перадавым у вёсцы. Таму вы павінны рашуча ўзмацніць сваю работу з тым, каб апраўдаць назву свайго калгасу, дабіўшыся гэтым новага калгаснага прыліву і ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі.

Мы пытаемся ў Санюкоўскага сельсавету чым тлумачыцца тое, што ён, як орган дыктатуры пролетарыяту, ня чуе голасу беднаты ў калгасах?

Мы патрабуем ад сельсавету тэрмінова правэрыць факты кулацкага засільля ў калгасах і рашуча ліквідаваць гэтае ганебнае зьявішча. Практыка нам паказала ,што пралетарскае кіраўніцтва, сацспаборніцтва і ўдарніцтва, разгорнутая самакрытыка лепшыя шляхі да пабудовы сацыялізму.

Ударная брыгада імя «518» калгасу «Ульянаўск»: ЛЕГЛІК ЯКАЎ, ЛЕГЛІК ЯЎГЕН, ГЕРАСІМЕНКА П.

Дакуль-жа Аршанскі райкалгассаюз

будзе іграць ролю маўчальніка?

Друк, са сваёй арміяй рабселькораў, дапамагае партыі арганізаваць масы на пасьпяховае выкананьне плянаў пяцігодкі, агітуе за разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва і разам з гэтым выкрывае недахопы ў рабоце, сыгналізуе аб прарывах, мабілізуючы ўвагу мас на ліквідацыю гэтых прарываў. І чым больш установы і арганізацыі, якіх датычыцца тая ці іншая заметка ў газэце, праявяць чуласьці да яе, хутчэй рэагуюць на яе, тым скарэй будуць ліквідаваца прарывы і недахопы і тым больш будзе умоў для пасьпяховага разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва.

Нажаль Аршанскі райкалгассаюз гэтага ня можа ці не жадае зразумець. Ён—галоўны маўчун па ўсяму Аршанскаму раёну ў справе рэагаваньня на заметкі і на рабселькораўскія допісы. Пытаньне калектывізацыі, падрыхтоўкі да веснавой сяўбы, кантрактацыі і зараз—правядзеньне самой сяўбы і г. д.—ня сходзілі са старонак Аршанскай раённай газэты «Ленінскі прызыў», а разам з гэтым са старонак газэты ня сходзіў і Райкалгассаюз. У кожным нумары газэты былі заметкі, на якія так альбо інакш Райкалгассаюз павінен быў рэагаваць. Яму так сама і рэдакцыя пасылала ня мала рабселькораўскіх допісаў на расьсьледваньне, але... Райкалгассаюз і не рэагуе і адказаў не дае... Ён маўчыць...

— Крычыць газэта? Пішуць селькоры? Няхай крычаць і пішуць, а мы памаўчым,—разважаюць работнікі Райкалгассаюзу, чытаючы заметкі ў газэце аб недахопах у іх рабоце.—Паглядзім хто каго з нас перамажа.

У лютым газэта зрабіла Райкалгассаюзу апошняе папярэджаньне і патрабавала тэрміновых адказаў. Але Райкалгассаюз чытае і маўчыць.

Ня лепей справа і з заметкамі ў цэнтральным друку. На іх таксама адказваў Райкалгассаюз — маўчаньнем. Бачычы ўсё гэта, Аршанская РСІ ўзялася за праверку становішча з рэагаваньнем на заметкі ў друку з боку Райкалгассаюзу. І што-ж яна знайшла? Ніякага ўліку заметак і допісаў і рэагаваньня на іх у Райкалгассаюзе няма.

— За паўгода ў нас было каля 90 заметак для рэагаваньня,—кажа намесьнік старшыні Райкалгассаюзу тав. Стаховіч,—але адказы мы далі толькі на 50 проц.

Тав. Стаховіч крыху памыліўся. За паўгода толькі ў «Ленінскім прызыве» было ня менш заметак, на якія Райкалгассаюз павінен быў рэагаваць. А дзе-ж цэнтральны друк? Аб ім тав. Стаховіч забыўся. Але што гаварыць, яго заява гэта інспэктару РСІ была толькі простай бюракратычнай адгаворкай.

У справах Райкалгассаюзу было знойдзена толькі 5 адказаў на заметкі. А ў папцы старшыні РайКС т. Масалкова знойдзена 6 допісаў, прысланых у Райкалгассаюз на рэагаваньне. Гэтыя допісы ляжаць па 2, 3 і больш месяцаў бяз вынікаў.

Усё гэта яскрава сьведчыць, што Райкалгассаюз ігнараваў дырэктывы ЦККК-НКРСІ аб рэагаваньні на заметкі ў друку і не выконваў іх. Прэзыдыум РСІ абвясьціў Масалкову і Стаховічу (старшыні і намесьніку яго) —вымову і даручыў даць на ўсе заметкі і допісы адказы да 15 мая.

Дадзены двухтыднёвы тэрмін і 15 мая ўжо прайшлі, але Райкалгассаюз і зараз усё яшчэ маўчыць і адказаў не дае. Для яго і пастанова РСІ—зьявілася пустым гукам.

Патрэбны больш рашучыя меры.

А. Кудрын.

Праз дэпутацкія групы

АЖЫЦЬЦЯВІМ РАШУЧЫ ПАВАРОТ ГАРСАВЕТАЎ ТВАРАМ ДА ВЫТВОРЧАСЬЦІ

Руйнуючы адпор апартуністычнай недаацэнцы ролі дэпутацкіх груп

Пакласьці канец апартуністычнай недаацэнцы дэпутацкіх груп

Дэпутацкая група, як савецкая ячэйка на вытворчасьці павінна быць застрэльшчыкам па правядзеньні ў жыцьцё ўсіх мерапрыемстваў партыі і савецкай улады. Дэпутацкія групы на вытворчасьці будуць жыцьцёвай і сапраўднай апорай гарсавету толькі ў тым выпадку, калі яна ахопіць усе пытаньні вытворчасьці, калі яна сапраўды паверне цела тварам да тэхнікі, калі дасьць новы моцны штуршок удар ніцтву і сацспаборніцтву.

Нядаўна масавы аддзел Віцебскага гарсавету склікаў першую нараду бюро дэпутацкіх груп, на якой быў пастаўлен інструкцыйны даклад аб рабоце дэпутацкіх груп і абмену вопытам праробленай работы. З дакладу і спрэчак, якія разгарнуліся на нарадзе, можна бачыць, што на сёньняшні дзень дырэктывы партыі і ўраду аб рабоце дэпутацкіх груп яшчэ шмат якімі кіраўнікамі партыйных і прафэсыянальных арганізацый на прадпрыемствах недаацэньваюцца і нявыкорыстоўваюцца. Так напрыклад, на шчацінным фабрыцы старшыня фабкому не згаджаўся з арганізацыяй групы матыўючы гэта тым, што ў яго паперах няма такой дырэктывы (?!). На панчошнай фабрыцы імя Клары Цэткін паўтара месяца назад створана дэпутацкая група, але да гэтага часу яна яшчэ не распачала практычнай работы. На чыгунцы старшынёй дэпутацкай групы абран былы старшыня гарсавету тав. Каваленка, але ён нічога не жадае рабіць. Сярод масы рабочых не праводзіцца ніякай растлумачальнай работы і група існуе фактычна толькі на паперы. Члены гарсавету амаль на ўсіх прадпрыемствах маюць па 5-7 нагрузак, але ні ў якім выпадку ні савецкія і фабрычна-заводзкія арганізацыі не жадаюць вызваляць іх для савецкай работы.

Партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі на мясцох не дапамагаюць дэпутацкім групам у наладжваньні работы (лесазавод № 13, «Сьцяг індустрыялізацыі» і інш.) і часта нават не вызначаюць дні для правядзеньня савецкай работы (фабрыка «Дзьвіна»). Аб нядбайных адносінах фабкомаў да гэтага пытаньня сьведчыць і той факт, што на нараду, на якую былі запрошаны прадстаўнікі ўсіх фабкомаў ніводзін з іх не зьявіўся.

Адзначыўшы ўсе гэтыя недахопы, нарада намеціла канкрэтныя шляхі далейшай работы дэпутацкіх груп. Прынята пастанова аб разгортваньні сацспаборніцтва паміж асобнымі групамі.

Міркін С. М.

Да адказнасьці галаваця паў з Віцебскага лесазаводу № 13

На Віцебскім лесазаводзе № 13 маецца 13 членаў і 15 актывістаў Гарсавету. Згодна пастановы прэзыдыуму Віцебскага Гарсавету тут патрэбна стварыць дэпутацкую групу, але ня гледзячы на тое, што па пастанове бюро Гаркому КП(б)Б арганізацыю гэтых груп трэба было скончыць 10 мая,—лесазавод яшчэ нічога не зрабіў.

Фабком кажа: «Жадаеце стварыць дэпутацкую групу бярэце новых дэпутатаў Гарсавету, таму, што абраныя вельмі перагружаны і ні ў якім разе ня змогуць працаваць у дэпутацкай групе». Тут-жа на паседжаньні ячэйкі вылучаюцца новыя таварышы для абраньня ў будучы склад Гарсавету і з іх прапануюць абраць бюро дэпутацкай групы. Вось да якой бязглуздзіцы даходзіць старшыня фабкому лесазаводу № 13.

Дырэктар заводу т. Шапіра на бюро ячэйкі заяўляе, што «кожны прыходзіць і дурыць галаву (!?) з якойта групай»... Гэтыя словы трэба разглядаць як недаацэнку груп і наогул як палітычную несьвядомасьць.

Вось як лесазавод № 13 падышоў да пытаньня стварэньня на заводзе дэпутацкай групы.

Адпаведныя арганізацыі павінны зрабіць з гэтага належныя вывады.

Л. Сьвярдлоў.

Парткалектыў і фабком „Кастрычніка" павінны тэрмінова выправіць памылку

Бярэце прыклад з дэпутацкай групы абутковай фабрыкі

Некаторыя фабрычна-заводзкія арганізацыі Менску дагэтуль яшчэ не зразумелі ўсяе важнасьці арганізацыі і наладжваньня работы дэпутацкіх груп на прадпрыемствах. У той час, як дэпутацкая група «Бальшавіка» шырока разгортвае сваю работу, на швэйнай фабрыцы «Кастрычнік» яе нават зусім няма. Хаця ў пачатку красавіка на «Кастрычніку» і была арганізавана дэпутацкая група, але Менгарсавет прымушан быў яе распусьціць, таму што стварэньне гэтай дэпутацкай групы было праведзена габінэтным парадкам, бяз удзелу грамадзкасьці, бяз прыцягненьня да яе работы актыву з рабочых фабрыкі. Больш таго, рабочыя нават зусім ня ведалі аб існаваньні дэпутацкай групы. Здавалася-б, што пасьля роспуску гэтай групы парткалектыў і фабком павінны былі тэрмінова выправіць дапушчаную памылку і арганізаваць сапраўдна-масавую дэпутацкую групу. Але нічога падобнага зроблена ня было. Старшыня фабкому, дэпутат гарсавету тав. Каган, нават ня ведае, калі яна будзе арганізавана.

Значна лепш стаіць справа з наладжваньнем работы дэпутацкай групы на Менскай абутковай фабрыцы.

Тут арганізаваная нядаўна дэпутацкая група за кароткі час свайго існаваньня ўжо шмат чаго зрабіла.

Дэпутацкая група абсьледвала палашэфны саўгас «Лекерта», прымацавала да яго двух дэпутатаў, якія дапамагаюць саўгасу ў складаньні вытворчых плянаў веснавой і ўборачнай кампаніі. Абсьледвана становішча грамадзкага харчаваньня і аховы працы на фабрыцы. На адным з сваіх паседжаньняў група заслухала даклад дырэктара аб выкананьні прамфінплану фабрыкі. Дэпутаты па цэхах прымаюць ад рабочых вусныя і пісьмовыя заявы і скаргі па жыльлёвых і іншых пытаньнях і прымаюць усе захады да зьнішчэньня недахопаў у рабоце свайго прадпрыемства.

Але разам з гэтымі дасягненьнямі дэпутацкая група абутковай фабрыкі мае і рад недахопаў. Асноўным з іх зьяўляецца тое, што вынікі абсьледваньняў і правядзімая работа ў цэхах не выносіцца на абгаварэньне шырокай грамадзкасьці прадпрыемства, у выніку чаго рабочыя ня ведаюць, аб дзейнасьці дэпутацкай групы. Як недахоп трэба адзначыць і тое,што партыйны і камсамольскі актыў недастаткова ўдзельнічаюць у рабоце групы.

Неабходна падкрэсьліць, што і з боку фабрычнага друку няма належнай ўвагі рабоце дэпутацкай групы. І шмат тыражка «Чырвоны абутнік», і цэхавыя насьценгазэты амаль зусім не асьвятляюць гэтага пытаньня.

Старшыня дэпутацкай групы тав. Жыжэмскі кажа, што і Менгарсавет дагэтуль яшчэ не дае выразных паказаньняў якім шляхам павінна праводзіць сваю работу дэпутацкая група.

Менгарсавет паставіў сваёй задачай перанесьці на менскія прапрыемствы работы дэпутацкіх груп харкаўскіх заводаў, але да апошняга часу яшчэ нічога не зрабіў, каб гэта ажыцьцявіць.

А. Ларычкаў.

Падрыхтоўку савецкіх кадраў—на баявыя тэмпы

Саветы павінны ўцягнуць працоўныя масы ў непасрэднае кіраўніцтва дзяржавай. Трэба рашуча ўзяцца за ажыцьцяўленьне лёзунгу нашай партыі аб павароце работы саветаў тварам да вытворчасьці, тварам да сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, да выкананьня пяцігодкі ў чатыры гады.

У гэтых умовах арганізацыя і замацаваньне савецкіх ячэек (дэпутацкіх груп) на прадпрыемствах, арганізацыя куткоў савецкага будаўніцтва і праз кароткатэрміновыя курсы падрыхтоўка савецкага актыву, зьяўляецца для саветаў і выканкомаў баявой задачай сёньняшняга дню.

Арганізуемыя на прадпрыемствах дэпутацкія групы ў сучасны момант знаходзяцца ў стадыі афармленьня і разгортваньня работы, асабліва ў гэты пэрыяд ім патрэбна арганізацыйна-практычная дапамога. Неабходна ў самы бліжэйшы час прымацаваць да кожнай дэпутацкай групы інструктароў, інспэктароў наркаматаў і цэнтральных установаў, навуковыя сілы, працаўнікоў савецкіх установаў, якія займаюцца пытаньнямі савецкага будаўніцтва, для практычнай работы ў вольныя часы з дэпутацкімі групамі на прадпрыемствах. Склікаемая гэтымі днямі пры арганструктарскім аддзеле ЦВК БССР пашыраная нарада па пытаньні практычнай работы дэпутацкіх груп, разам з кіраўнікамі гэтых груп, павінна намеціць практычныя шляхі, па якіх павядуць сваю работу дэпутацкія групы.

Побач з гэтым, асаблівую ўвагу трэба аддаць сельсаветам, якія павінны стаць на чале калгаснага руху.

Згодна пастановы Прэзыдыуму ЦВК БССР у чэрвені месяцы ў Менску адчыняюцца курсы для жанчын-старшынь гарадзкіх, сельскіх і мястачковых саветаў. Апроч таго, да гэтых курсаў неабходна прыцягнуць жанчын—членаў саветаў, па аднэй з раёну і гарсавету. У раёнах павінны быць праведзены кароткатэрміновыя (5-10 дзён) курсы-канфэрэнцыі для жанчын-членаў саветаў. Кожны райвыканком у чэрвені павінен правесьці месячныя курсы старшынь і сакратароў сельсаветаў.

Усе зьвены партыйных, прафэсыянальных і савецкіх арганізацый павінны садзейнічаць арганізацыі курсаў, якія-б ва ўдарным парадку, на аснове шырока-разгорнутага сацспаборніцтва, падрыхтавалі лепшых савецкіх актывістаў-ударнікаў.

Нам трэба дабіцца арганізацыі пры саветах і райвыканкомах куткоў савецкага будаўніцтва і, побач з існуючым факультэтам савецкага будаўніцтва і права пры БДУ, адчыніць у Менску цэнтральны дом савецкага будаўніцтва, каб тэтым самым замацаваць сталую курсавую падрыхтоўку савецкага актыву. Навуковым сілам інстытутаў і факультэтаў савецкага будаўніцтва патрэбна стаць сапраўднымі кансультантамі ў рабоце па падрыхтоўцы савецкіх кадраў і наладзіць сталую сувязь з саветамі і выканкомамі з мэтай практычнай дапамогі апошнім.

Усе гэтыя мерапрыемствы, плюс арганізацыя завочнага навучаньня, дапамогуць нам вырашыць адну з важнейшых праблем сёньняшняга дню—праблему савецкіх кадраў.

Адамчук.

Ударыць па зрыўшчыках рабочага забясьпечаньня

Арганізацыя малочных таварных фэрм у Слуцкім раёне знаходзіцца пад пагрозай зрыву. Работа гэта праходзіць надзвычайна марудна. Замест 22 умоў, заключана толькі 6.

Замест таго, каб арганізаваць у раёне 14 сьвінагадоўчых таварных фэрм і 7 малочна-таварных фэрм, у калгасах да гэтага часу не арганізавана ні воднай.

Калгас «Першага Мая», які знаходзіцца ў гор. Слуцку і павінен поўнасьцю быць пераведзен у прыгарадныя малочныя гаспадаркі, не распачаў гэтай работы.

Пастанова райкалгассаюзу аб давядзеньні кантрольных лічбаў да кожнай гаспадаркі ў паасобку яшчэ поўнасьцю ня выканана.

Ня выконваецца і пастанова аб тым, каб ўся годная жывёла, якая паступае на загатоўчыя пункты, накіроўвалася непасрэдна ў малочна-таварныя фэрмы.

Неабходна зараз жа прыняць канкрэтныя захады для ліквідацыі прарыву ў арганізацыі малочна-таварных фэрм. Неабходна жорстка ўдарыць па зрыўшчыках рабочага забясьпечэньня.

Л. Хаўкін.

Забясьпечыць калгасы насеннай бульбай

Па калгасах Рэчыцкага раёну адчуваецца вялікі недахват насеннай бульбы. Паводле прыблізных падлікаў райкалгассаюзу, калгасы не забясьпечаны насеннай бульбай на 50 проц.

Вялікі недахват бульбы адчуваецца ў самым буйным калгасе раёну «Калініна». Але і ў радзе іншых калгасаў справа ня лепш. Недахват насеннай бульбы трэба тлумачыць тым, што бульбазагатоўкі па раёне яшчэ ня выкананы, кулакі ў некаторых сельсаветах ухіліліся ад цьвёрдых заданьняў па бульбе. Так, па в. Гарыводы, Перасьветаўскага сельсавету, вызначаная норма загатоўкі бульбы была разьмеркавана паміж маламоцнымі гаспадаркамі, у той час, як зусім не атрымаў цьвёрдага заданьня былы гандляр-кулак Мароз М.

Райкалгассаюзу і райвыканкому патрэбна тэрмінова прыняць рашучыя захады па спагнаньні цьвёрдых заданьняў і па выкананьні бульбазагатоўкі, каб гэтым самым забясьпечыць калгасы насеннай бульбай, адхіліўшы пагрозу недавыкананьня пляну засеву бульбы.

Нікмар.

Камандзіры пралетарскай грамадзкай думкі

I

Наш друк—калектыўны агітатар, прапагандыст і арганізатар. Іменна ў гэтай прыадзінай ленінскай формуле даны прынцыповыя карэнныя якасьці адрозьніваньні бальшавіцкага друку ад друку буржуазнага. Іменна гэтыя якасьці нашага друку, сьцягам якога зьяўляецца ленінізм, узброілі яго (друк) такой магутнай зброяй, як рабселькораўскі рух. Рабселькораўскі рух уласьцівы толькі друку бальшавізма, друку адзінай партыі рабочае клясы—друку камуністычнай партыі.

Рабселькораўскі рух вырас у магутную сілу. Рабселькораўскі рух цяпер прадстаўляе сабой трохмільённую армію. Аднак, справа ня толькі ў колькасным росьце рабселькораў. Найважнейшае заключаецца ў тым, што «у вялікай ступені вырасла значэньне рабселькораўскага руху як актыўнага правадніка генэральнай лініі партыі» (з пастановы ЦК УсеКП(б) ад 16-IV—1931 г.).

Рабселькораўскі рух цяпер знаходзіцца на новым этапе. Новыя задачы стаяць перад нашай партыяй, яе друкам і, такім чынам, перад верным памоцнікам партыі — рабселькораўскім рухам. Мы ўступілі ў першы пэрыяд сацыялізму, мы завяршаем у гэтым годзе фундамант сацыялістычнай эканомікі СССР. Магутна разгортваецца калгасны рух, які паставіў ужо пад калгасны сьцяг больш паловы сялянскіх гаспадарак СССР. Па ўсёй краіне ідзе пераможны бой за «518» і «1040». На шляхах індустрыялізацыі і на базе суцэльнай калектывізацыі ліквідуецца апошняя эксплёататарская кляса ў СССР, апошні аплот капіталізму ў нашай краіне—кулацтва.

На гэтым адказьнейшым, труднейшым і рашаючым перавале неабходна з усёй сур'ёзнасьцю, ва ўсёй шырыні і глыбіні падагуліць вопыт рабселькораўскага руху, падвесьці вынік пройдзеных этапаў і намецець канкрэтныя шляхі рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б) аб перабудове рабселькораўскага руху, пастановы, якая зьяўляецца нашай разгорнутай баявой праграмай.

II

Першародным грахом апартуністычных установак у пытаньнях рабселькораўскага руху зьяўляецца тое, што для апартуністаў таямніцаю за сям'ю пячаткамі былі арганізацыйныя прынцыпы ленінізму і—як вынік з гэтага—арганізаторскія функцыі нашага бальшавіцкага друку.

Для Троцкага «газэта існуе перш усяго для таго, каб зьвязваць людзей разам, паведамляючы ім аб тым, што і дзе робіцца». Значыцца, для Троцкага газэта—ня зброя клясавай барацьбы, а крыніца асьведамленьня, просты інфарматар, просты перадатчык навін. Значыцца, вучэньне контрэволюцыйнага трацкізму аб друку ў аснове сваёй мае адмаўленьне клясавага характару газэт, адмаўленьне прынцыпу партыйнасьці літаратуры.

Погляды Троцкага цалкам супадаюць з поглядамі Каўцкага. Вось што піша Карл Каўцкі ў сваёй «Представительной форме управления»: «Газэта неабходна чытачу з-за зьмяшчаемых ў ёй паведамленьняў, а не з-за правадімых у ёй поглядаў... Газэта—гэта апарат, які зьбірае паведамленьні і перадае іх прамадзе».

Гэта супаданьне поглядаў контрэвалюцыянэра Троцкага і закаранелага рэнегата Каўцкага, гэтага зьлейшага ворага Савецкага саюзу, зусім заканамерна, бо трацкізм ніколі ня быў нічым іншым як аднэй з розна-відніасьцій меншавізму.

Зусім зразумела, што «тэорыя» Троцкага (і яго вучняў—Курса, Гуса і інш.) аб унеклясавасьці і ўнепартыйнасьці друку харчавала і яго-жа адпаведныя ўстаноўкі ў пытаньнях рабселькораўскага руху.

У сваім артыкуле «Рабкор і яго культурная роля» Троцкі пісаў: «Рабкор—орган прамадзкага сумленьня, які сочыць, які выкрывае, які патрабуе, які настойвае».

Параўнайце гэту формулу з сталінскім разуменьнем значэньня рабселькораў як «камандзіраў пралетарскай прамадзкай думкі, якія стараюцца нажіраваць нявычарпальныя сілы гэтага найвялікшага фактару на дапамогу партыі і савецкай улады ў друдзкай справе сацыялістычнага будаўніцтва», і зразумелым стане куды цягнуў Троцкі. Клясавы характар бальшавіцкага друку і народжанага ім рабселькораўскага руху застаўся для Троцкага глыбокай таямніцай, неразгаданай загадкай. Так-жа сама незразумеў Троцкі і значэньня арганізатарскай ролі бальшавіцкага друку і рабселькораў.

Ды хіба мог быць для Троцкага рабселькор арганізатарам, калі Троцкі разумеў рабселькораўскі рух як рух адсталых мас, а не перадавікоў, не актыўных барацьбітоў за сацыялістычную грамаду. Вось што піша Троцкі: «Рабочая кляса прачнулася для культуры. І рабочы карэспандэнт зьяўляецца адным з выразаў гэтага абуджэньня клясы. У гэтым асноўная розьніца рабкора ад іншых пісьменьніцкіх груп, гэтым вымяраецца, гэтым вызначаецца сэнс яго работы ,яго ролі, абхват яго інтарэсаў». (Зб. творэў Троцкага, том XXI, стар. 182).

Разумеючы і расцэньваючы рабселькораўскі рух як рух адсталых мас, а друк, як крыніцу інфармацыі («Інфармацыя—душа газэты»), Троцкі лёгічна вёў да выводу, што рабкор не актыўны ўдзельнік, не арганізатар сацыялістычнага будаўніцтва, што рабкор «ўспрымае ўсё, чым жыве і дыхае рабочая кляса», і што ў гэтым толькі і сэнс яго існаваньня.

III

Іншымі шляхамі і з другога канца, але да тых жа ў асноўным вывадаў аб месцы, ролі і задачах рабселькораўскага руху ішлі правыя апартуністы.

Так, на чацьвертай Ўсесаюзнай нарадзе рабселькораў тав. Бухарын спрабаваў дэзарыентаваць рабселькораўскі рух у асноўных пытаньнях сацыялістычнага будаўніцтва. Выкладаючы перад нарадай па сутнасьці сваю правапартуністычную плятформу, тав. Бухарын гаварыў:

«Рашаючая, пераважная маса хлеба вырабляецца у іх (дробных і драбнейшых сялянскіх гаспадарках —С. М.)—і доўга яшчэ будзе вырабляцца. Ды і вялізарнейшыя масы жывых людзей

Чарапашыя тэмпы работы

фінансавых органаў у Копыскім, Рагачоўскім і Пухавіцкім раёнах ставяць пад пагрозу зрыву фінплян

Камсоды заводаў імя Ланцуцкага, „Рухавік Рэвалюцыі“, „Калектыўная Праца“ і „Везуві“ стаяць у баку ад мабілізацыі сродкаў

Мабілізаваць рабочыя масы, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў на поўнае выкананьне фінпляну трэцяга рашаючага. Разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва

Ліквідаваць прарыў

(Копысь)

Па даручэньні Копыскай РКК-РСІ ўдарнай рабселькораўская брыгада газ. «Сав. Бел.» быў зроблен налёт на Стараселькае Сельпо.

У выніку налёту выяўлена, што з боку Сельпо на збор паднакапленьняў ня было зьвернута ўвагі, у выніку чаго заданьне другога кварталу на 18 мая выканана толькі на 6,5 проц. За ўвесь час ня ўцягнута ў шэрагі пайнікаў ніводнага чалавека. Каапэраваньне Райсельпо праходзіць самацёкам. Вакол гэтага пытаньня ня створана грамадзкая думка. Замест каапэраваньня 340 чал. па заданьню, каапэраваны толькі 98 чал.

Яшчэ да гэтага часу ў Сельпо няма нават пляну кантрактацыі жывёлы і маладняка, а таксама малака. Гэтае пытаньне пад пагрозай зрыву. Такач бязьдзейнасьць выклікае масавы забой маладняка і невыкананьне загадаў ўраду аб здыманьні сьвіных скур.

Шмат дэфіцытных тавараў, якія прывозяць у каапэрацыю, зараз-жа зьнікаюць невядома куды. Старшыня Сельпо т. Розэнман кажа: «я і сам ня ведаю куды яны дзяюцца».

Апрача гэтага, каапэрацыя адчыняецца несваячасова. Маюцца такія выпадкі, што пасьля 6 гадзін, калі каапэрацыя закрываецца, туды заходзяць «свае людзі». Скрынкі для скаргаў у каапэрацыі няма.

Ударная рабселькораўская брыгада «Сав. Бел.»: А. Генін, Росман, Батурэвіч.

Грашовая запазычанасьць за кулакамі

Мабілізацыя сродкаў па **Гадзілаўскім сельсавеце, Рагачоўскага раёну,** правальваецца. Яшчэ дагэтуль не спагнана з насельніцтва да 3.000 руб., у тым ліку па падатку недоімкі—526 руб., па страхоўцы—775 р., самаабкладаньні—400 р., аднаразовым зборы—700 руб. Галоўным неплацельшчыкам зьяўляецца кулак. Ёсьць такія кулацка-заможныя гаспадаркі, якія павінны дзяржаве па 70—100 руб., а сельсавет ніякіх мер прымусовага спагнаньня ня прымае да такіх гаспадарак.

Былі выпадкі, калі сакратар сельсавету Ніжцін браў грошы ад сялян у кішэню ,а потым да селяніна прыходзілі ў другі раз спаганяць с.-г. падатак, або страхоўку.

Я. Крушына.

Стаўка на самацёк

Петрыкаў. (Наш. кар.). Плян мабілізацыі сродкаў першага кварталу па Петрыкаўшчыне выкананы усяго на 79 проц. Плян другога кварталу таксама зрываецца. Такое выкананьне фінпляну гаворыць аб тым, што пры захаваньні такіх тэмпаў плян выкаканы ня будзе.

Асабліва дрэнна стаіць справа са зваротам сельска-гаспадарчых пазык, плян якіх выкананы на 15 мая ўсяго 13,4 проц., па аднаразовым зборы па горадзе—4 проц., па рэалізацыі акцый Трактарацэнтру — 6,3 проц., аднаразовы збор па раёне—12,3 проц. Такое-ж становішча і з выкананьнем першага кварталу па азначаных галінах.

Бузумоўна, апартуністычнае спадзяваньне на самацёк як раённых, так і сельскіх арганізацый—іншых вынікаў не магло даць.

Трэба адзначыць, што райкамсод бязьдзейнічае і зусім ня кіруе сельскім камсодамі.

Лепш справа з рэалізацыяй пазыкі (60 проц.).

Па ўкладаньнях таксама маецца дасягненьне. На сёньняшні дзень плян выкананы на 79 проц., па мэтавых пазыках—4 проц.

Райкамсоду трэба з бальшавіцкай энэргіяй узяцца за работу і падштурхнуць вясковыя камсоды.

А. Курдо.

Спадзяюцца на самацёк

(Капаткевіцкі раён).

Новы сельска-гаспадарчы падатак па 1931 год ёсьць падатак, які накіраван на тое ,каб садзейнічаць калектывізацыі бядняцка-сераднякіх мас вёскі, ён накіраван супроць кулака.

Закон прадугледжвае буйныя ільготы, якія неабходна папулярызаваць сярод працоўнага насельніцтва. А што мы маем у Капаткевіцкім раёне?

Да гэтага часу пытаньні аб новым сельска-гаспадарчым падатку ня ставіліся нідзе. Не ва ўсіх сельсаветах створаны камісіі па аб'ектах абкладаньня (Чэрабоўскі, Бесядзкі і інш.).

Працаўнікі Райфа ў сельсаветы не выязджаюць. Бухгальтар РВК Гутман ня лічыць патрэбным выехаць хоць раз у сельсавет па гэтым пытаньні.

Трэба ўдарыць па права-апартуністычнаму спадзяваньню на самацёк.

Лясун.

Штурм павінен зрабіць пералом

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Кожны новы дзень дэкады штурму прыносіць новыя тысячы рублёў прыліву ў ашчадкасы. Кал. на 15 мая было 9.369 руб., дык на 16 мая—15.037 руб., 17 мая—23.649 руб., 18 мая—36.560 руб., 19 мая—39.615 руб., 20-21 мая—58.424 р. Патрэбна адзначыць, што большасьць парткалектываў Гомелю — **завод імя Ланцуцкага, ф-ка «Везуві», «Калпраца», «Рухавік Рэвалюцыі», Добруш** і амаль усе вясковыя ячэйкі стаяць у баку ад актыўнага ўдзелу ў правядзеньні штурму па ліквідацыі прарыву ў фінпляне другога кварталу, што ставіць пад пагрозу выкананьне фінпляну.

Там, дзе работа разгорнута як сьлед, наглядаюцца добрыя вынікі. Напрыклад, па **Гомсельмашы** за дні штурму ўкладчыкам ў ашчадкасы ўцягнута 398 рабочых, прыліў у ашчадкасу выражаецца ў суме 2.281 руб. 160 чалавек дадаткова падпісаліся на пазыку па 10 руб. Брыгада ліцейнага цэху пастанавіла ўсю сваю пэнсію ўкласьці ў ашчадкасу.

А. Е.

ВЫКЛІКАЕМ ПАДЗЯ ЛІЦЦА ВОПЫТАМ

Менская 9 фабрычна-заводзкая сямігодка добра падрыхтавана да 2 бальшавіцкай вясны. Был. мабілізаваны ня толькі вучні, і настаўнікі, зварухнуліся і бацькі вучняў. Пагэтаму пляны значна перавыкананы.

Сельска-гаспадарчай літаратуры па 2 бальшавіцкай вясьне сілами вучняў распаўсюджана на суму 150 руб.

Збор на **трактарную калёну** даў 217 руб. 73 к. Попелу сабрана каля 6.000 кілёграм.

Саду саўгасу не пагражае чэрвь ў гэтым годзе, бо вучнямі школы зроблены ў школьных майстэрнях і разьве шаны ў садзе 32 шпакоўніцы. Уцільсы равіны сабрана на суму 93 руб.

Для непасрэднага ўдзелу ў працы на палёх саўгасу «Санжаны», з якім зьвязана школа ,было адпрацавана пры закладцы парніковых рам 103 чалавекадзён. Школы кожны дзень накіроўвала ў саўгас 30—40 чалавек для працы. Чысьцім сад, перабіраем насенную бульбу і далей на пляне будзем яе садзіць, а пасьля палоць трускаўкі і інш. садовіну і гародніну. Праца ў саўгасе, як і праца на заводзе, унесена ў расклад працы школы, бо саўгас зьяўляецца адным з аб'ектаў, дзе праводзіцца палітэхнізацыя. Пры праходжаньні праграмнага матар'ялу ў школе робяцца вывады: які ўдзел павінен прыняць кляса, школа і асобныя брыгады і вучні ў працы саўгасу, у правядзеньні другой бальшавіцкай вясны.

Мы выклікаем ЗФЗС і інш. школы Менску падзяліцца вопытам працы.

Я. Кацэнбогін.

Агіднейшы факт

У той час, калі ўся ўвага нашай грамадзкасьці накіравана на разгортваньне ашчаднай справы, знаходзяцца такія «работнікі», якія ня выконваюць, а зрываюць дырэктывы партыі і ўраду па мабілізацыі сродкаў. Вось як агідны факт меў месца ня так даўно ў **Асіпавіцкім** раёне.

«Ст. Асіпавічы, К-о фэльчару Мадко Н. Б. К. 6. 23-III-31 г.

Пры звароце нявыдадзенай пэнсіі ў ашчадкасу, разьлічвайцеся налічнымі прашыма.

У адносінах уплаты пэнсіі трымацелям ашчадкніжак праз ашчадкасу, надалей да распадаржэньня ўстрымайцеся, бо рэальнай дырэктывы па ўвялічэньні ўкладаньняў няма.

М. Б. 6.

Начальнік фінанс. пр. раёну **Ярашэнка».**

Такі галавацяпскі загад быў атрыманы тэлеграфна ад Ярашэнкі.

Трэба выясьніць: гэта нядбайнасьць ці шкодніцтва.

Вершанік.

„ЗГУБІЛІ“ КУЛАКОЎ

(Шэйскі сельсавет, Крупскі р-н)

Да гэтага часу Шэйскі сельсавет «ня змог адшукаць» для дачы цьвёрдых заданьняў шэрату заможнікаў, сярод якіх: Купрыянавы Атрахім і Ягор, Прышкала Пятрок, Пухарэнка Цімох, Генчыкі Хведар і Андрэй.

Раённым арганізацыям трэба на гэта зьвярнуць сваю ўвагу і прыцягнуць да адказнасьці прыхільнікаў кулака.

Ударнік.

Акцыі Трактарацэнтру не рэалізуюцца

Дабрагушчанскі сельсавет (Жлобінскага раёну) даўно ўжо атрымаў плян рэалізацыі акцый Трактарацэнтру на другі квартал, але-ж работа па рэалізацыі акцый у сельсавеце зусім не праводзіцца. Пляны рэалізацыі да асобных вёсак яшчэ не даведзены. Калгасы і бядняцка-сераднякцкае сялянства аб акцыях Трактарацэнтру ня ведаюць. Жлобінскі РВК на нядбайныя адносіны сельсавету да гэтай важнейшай кампаніі не зьвяртае ўвагі.

Ячэйка КП(б) і Дабрагушчанскі сельсавет павінны рашуча ўзяцца за працу з тым, каб поўнасьцю выканаць плян рэалізацыі акцый па сельсавеце.

К. Хведарскі.

Прымеце выклік на сацспаборніцтва. Прапойскаму райфа

На падставе пастановы пленуму РВК ад 15-га мая 1931 г. **Чэрыкаўскае Райфа** выклікае вас на сацспаборніцтва на лепшае правядзеньне кампаніі па сельгаспадатку на 1931 год.

Са свайго боку Райфа высоўвае наступныя мерапрыемствы:

Лепшае правядзеньне агітацыйна-масавай кампаніі. Поўнае выяўленьне аб'ектаў абкладаньня і страхоўкі. Рост аб'ектаў у параўнаньні з мінулым годам. Поўнае выяўленьне неземляробчых заработкаў і кан'юнктурных даходаў. Выяўленьне кулакоў. Правільнае вызваленьне беднаты. Своячасовае ўручэньне акладных лістоў. Агітацыйная кампанія па датэрміновай здачы с.-г. падатку і страхоўкі.

Чырэкаўскае Райфа.

Разгарнуць работу

Па **Халопеніцкім** раёне шмат па якіх вёсках і сельсаветах не разгорнута растлумачальная работа па сельгаспадатку на 1931 год.

Сельсаветы зусім не зварочваюць увагі на гэтую работу, не ўвязваюць з другімі гаспадарча - палітычнымі кампаніямі. Камсамольскім і грамадзкім арганізацыям трэба разгарнуць работу ў гэтым напрамку.

Р.

Спагнаць запазычанасьць з кулакоў

Па **Гарэліцкім сельсавеце (Пухавіцкі раён)** за кулакамі лічыцца запазычанасьць 1.000 руб. Старшыня сельсавету жажа, што няма дзе ўзяць грошай. Трэба спагнаць з кулакоў запазычанасьць і тады грошы знойдуцца.

Шэляг.

Усесаюзная льняная пераклічка

На ільняным фронце без перамен

Заходняя і Ленінградзкая вобласьці выклікалі БССР уключыцца ва ўсесаюзную лёнавую пераклічку. З таго моманту мінула ўжо шмат часу, але на сёньняшні дзень ніводзін лёнаводны раён БССР ня гледзячы на заклік друку яшчэ не адгукнуўся на выклік Заходняй і Ленінградзкай вобласьцей.

У якасьці аднэй з умоў у гэтай пераклічцы было мерапрыемства аб ліквідацыі прарываў на фронце загатоўкі лёну. У часе лёнавай пераклічкі тэмпы загатоўкі павінны былі ўзьняцца. Між тым ход лёназагатовак па БССР за апошнія дні стварае яўную пагрозу выкананьня пляну.

На 20-га мая плян па лёназагатоўках выканан на 41,2 проц. У параўнаньні з мінулай пяцідзёнкай ніякага эруху ў бок павялічэньня няма.

Рад раёнаў яшчэ і да гэтага часу цягнуцца ў хвасьце і тонебна адстаюць. Процант выкананьня ў сярэднім па гэтых раёнах хістаецца ад 10 да 22.

Так, Асіпавіцкі раён па лёнавалакну выканаў плян на 16 проц., Азарыцкі—на 22,6 проц., Быхаўскі—на 18,8 проц., Глускі—на 20,3 проц., Гомельскі—на 17,2 проц., Журавіцкі—на 19,2 проц., Лагойскі—на 16,7 проц., Мазырскі—на 10,6 проц., Нараўлянскі—на 12 проц. і г. д.

Амаль такое-ж становішча з выкананьнем пляну і па лёнасемяні.

Рад раёнаў нават ня выканалі паловы заданьня.

Вульскі раён выканаў плян на 25 проц., Лядзянскі—на 11,9 проц., Любаньскі—на 39 проц., Парыцкі—на 27 проц., Клічаўскі—на 32,3 проц., і г. д.

Цэлы рад раёнаў зусім не даюць зьвестак аб тым, як праходзіць загатоўка лёнасемяні і лёнавалакна.

Менскі раён, аб якім мы ўжо мінулы раз пісалі, на працягу 3-х месяцаў не дае ніякіх зьвестак аб ходзе загатовак.

Не даюць зьвестак таксама і Азарыцкі, Бягомльскі, Прапойскі, Старобінскі і Смалявіцкі раёны.

Становішча з выкананьнем і спагнаньне цьвёрдых заданьняў з кулацка-заможных гаспадарак за апошнія 10 дзён не зьмянілася. На мясцох яшчэ да гэтага часу апартуністычна адносяцца да спагнаньня цьвёрдых заданьняў з кулака.

Мінулы раз мы патрабавалі ад пракуратуры прыцягнуць да адказнасьці канкрэтных вінавайцаў зрыву лёназагатовак. Да гэтага часу пракуратура не паведаміла нам яшчэ аб тых канкрэтных мерапрыемствах, якія ёю былі прыняты.

Зрыўшчыкі застаюцца беспакаранымі.

Ня можа быць такога становішча каб прарыў, які наглядаецца ў лёназагатоўках, ня меў канкрэтных вінавайцаў.

Чакаем ад пракуратуры канкрэтнага адказу.

ЗМАГАЦЦА ЗА
240.000 га лёну,
40.000 га канапель.

Усе сілы на выкананьне наказу партыі і ўраду

З пастановы праўленьня Белільнасаюзу па пытаньню выкананьня пастановы СНК і ЦК КП(б)Б за 4-е мая г. г. „аб мерапрыемствах для пашырэньня пасеву лёну і канапель у веснавую пасеўкампанію 1931 году“

Адзначаючы вялізарнейшае значэньне пастановы СНК і ЦК КП(б)Б у справе разьвіцьця лёнаводства і канаплеводства БССР і ў мэтах поўнага і своячасовага выкананьня ўсіх адзначаных у пастанове мерапрыемстваў для пашырэньня пасеву лёну і канапель у другую бальшавіцкую вясну, праўленьне Белільнасаюзу пастанавіла:

Мабілізаваць да канца севу ўвесь апарат і каапэрацыйны актыў лёнаканаплеводнай сыстэмы с-г. каапэрацыі БССР на правядзеньне ў баявым ударным парадку ўсіх мерапрыемстваў, забясьпечваючы пашырэньне пасеваў ільну і канапель, паводле вызначаных плянаў сяўбы.

Акрамя таго, Праўленьне прапанавала райкаапсаюзам мабілізаваць і паслаць у сельсаветы ўвесь актыў свайго апарату на ўвесь час сяўбы для правядзеньня ў калгасах, таварыствах і паселішчах непасрэднай работы па праверцы выкананьня кантрактацыйных дагавораў па тэхнічных культурах і па забясьпячэньню вызначаных плянаў засеву па гэтых культурах. Разам з тым райкаапсаюзам дабіцца мабілізацыі і пасылкі ў с-с усяго актыву раёна для гэтай-жа мэты.

У гэтай-жа пастанове гаворыцца: мабілізаваць і паслаць у раёны тэрмінам да 15 чэрвеня з апарату Белільнасаюзу на правядзеньне севу лёна і канапель увесь інструктарскі, агранамічны і апэрацыйны персанал. Пасеўтройцы разьмеркаваць гэтых работнікаў па найбольш адстаючым раёнам і не пазьней 22 мая камандыраваць іх у раёны.

Прапанаваць райкаапсаюзам у 5-ці дзённы тэрмін поўнасьцю закончыць кантрактацыю лёну і канапель і зараз-жа арганізаваць масавую праверку выкананьня пасеўнікамі заключаных дагавораў па кантрактацыі тэхнічных культур.

Пры праверцы дагавораў па кантрактацыі райкаапсаюзам расторгнуць усе дагаворы па кантрактацыі зернавых культур з гаспадарамі ўжо заключанымі дагаворы на пасеў лёну і канапель у разьмерах, даючых права на ільготу, паводле пастановы СНК БССР за 2-е сакавіка 1931 г. «Пра ўстанаўленьне для лёнаканаплеводных раёнаў процанту пасеву лёну і канапель, пры выкананьні якога ў калгасах і адасобных бядняцка-сераднякіх гаспадарак не праводзіцца кантрактацыя збожжавых культур» (газэта «Савецкая Беларусь» № 53).

Райкаапсаюзам тэрмінова разгарнуць шырокую масавую кампанію па растлумачэньню сярод калгасьнікаў і бядняцка - сераднякіх аднасобных гаспадарак, вызначаных СНК і ЦК КП(б)Б ільгот для пасеўнікаў лёну і канапель, абгаварыўшы гэтыя ільготы на агульных сходах калгасьнікаў, сходах беднаты, сходах жанчын і бядняцка сераднякіх сходах.

На аснове пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб пашырэньні пасеваў лёну і канапель у калгасах раёнаў дзейнасьці МТС і ў калгасах лёнаканаплеводных раёнаў, прапанаваць райкаапсаюзам **не пазьней чым да 1-га чэрвеня** пераключыць дагаворы на кантрактацыю лёну і канапель з калгасамі і гаспадаркамі ў лёнаводных раёнах і раёнах дзейнасьці МТС з тым, каб процант пасеву ільну і канапель у калгасах раёнаў дзейнасьці МТС давесьці ня менш як да 30 проц. яравога кліну гэткіх калгасаў, а ва ўсіх лёнаводных калгасах плошча пасева лёну і канапель было-б **ня менш як 25 проц.**

Райкаапсаюзам устанавіць пільна грамадзкі кантроль над поўным выкананьнем пляну засеву лёну і канапель па цьвёрдым заданьням у кулацка-заможных гаспадарках, прыцягнуўшы да гэтай справы калгасьнікаў, беднату і батрацтва.

Вылучаныя 6000 руб. на прэміі па кантрактацыі тэхнічных культур для забясьпячэньня фактычнага засеву закантрактаваных плошчаў выдаваць толькі па фактычнаму засеву гэтых плошчаў. Пасеўтройцы прапрацаваць сілы.

Загатоўчыя цэны на льновалакно і пяньку павялічаны

Усім Райснабам, Райкоопсаюзам, Райсаюзам

РАДЫЁГРАМА

22 мая загатоўчыя цэны тропанага ільна, кудзелі сырца ільняной саломы, трасты, пянькі павышаюцца на трыццаць процантаў супроць існуючых цэн. Павышэньне распаўсюджваецца на дальнейшыя нарыхтоўкі ўраджаю гэтага году, а таксама ўраджая 1931 году. Шырока апавясьціце аб гэтым здатчыкаў пасеўшчыкаў ільна канаплі.

Наркамснаб КРАСОЎСКІ
Белільнасаюз ЛАЦІС
Белкоопсаюз ХАСКІН

Хто зойме першае месца

ў ганаровым сьпісе на атрыманьне сьцягу другой калгаснай?

Перадавыя калгасы, якія ўключыліся ў конкурс, на справе скарацілі тэрміны сяўбы, разгарнулі масавы калгасны прыліў, рыхтуюцца да ўборкі

Кожны прапушчаны дзень—удар па праграме

Скончылі сяўбу своячасова, рыхтуемся да ўборкі

Рапарт

Калгас імя газэты «Савецкая Беларусь», дзякуючы прынятым бальшавіцкім тэмпам работы і разгорнутаму сацспаборніцтву і ўдарніцтву, 20 мая скончыў сяўбу.

На зьдзельную работу калгас перайшоў 27 красавіка. З увядзеньнем зьдзельшчыны адразу падвысілася прадукцыйнасьць працы.

Зараз калгас мае пахаці 132 га, сенажаці 85 га, выгану 25 га. Коняй у калгасе 20, кароў 25, цялят 24, сьвіней 8, парасят 12, бык вытворнік 1, кныр адзін. Сельска-гаспадарчымі машынамі калгас забясьпечан, ёсьць дыскавая сявалка, жняярка, сакаўскіх плугоў 3 шт., культиватараў 2 шт.

Калгас складаецца з 23 бядняцка-сераднякіх гаспадарак і з 12 сямействаў рабочых і служачых. У часе правядзеньня сяўбы былі складзены 8 рабочых брыгад.

Па ўдарнаму скончыўшы сяўбу, калгас абвяшчае сябе ўдарнікам па правядзеньню ўборачнай кампаніі.

Старшыня калгасу — Шаткоўскі Рыгор, паляводм Маскалевіч Карп.

Ударная брыгада баранавікоў Ляўковіча (калгас імя Дзяржынскага, Будараён).

Плян пасеўкампаніі выканан на ўсе 100 проц. Аўса засеялі 22,35 га, ячменю 2,5 га, пшаніцы 2,5 га, лёну—5 га, каноплі—0,05 га, бульбы—20 га, сілосных траў— 2 га. Вікі насеннай—0,5 га, канюшыны падсеянай—6 га, лубіну насеннага—4,5 га, цыбулі насеннай 0,05 га, сталовых буракоў—1 га, гуркоў—2 га, морквы—0,5 га, фасолі—1,25, памідораў—0,5 га, і іншых культур 2 га.

Апрача гэтага пасаджана саду 7 га, пабудавана абора для кароў на 40 галоў.

За час веснавой сяўбы ў калгас уступіла 8 бядняцка-сераднякіх гаспадарак.

Прымеце выклік!

На агульным сходзе калгасу імя Чарвякова, Віцебскага раёну, брыгадай рабселькораў газэт «Віцебскі Пралетары» і «Савецкая Беларусь» была зачытана пастанова ЦК партыі аб правядзеньні конкурсу на лепшае правядзеньне сяўбы і ўмовах гэтага конкурсу.

У адказ на гэту пастанову калгасьнікі ўключыліся ў конкурс і бяруцца выканаць пасеўны плян у тэрмін поўнасьцю, выканаць аграмінумум, наладзіць па сапраўднаму зьдзельшчыну. Калгас імя Чарвякова выклікаў на сацспаборніцтва па лепшаму правядзеньню сяўбы саўгас Хоцініцы і калгас «Бяроза».

Брыгадзір газэты «Савецкая Беларусь» МІЦЬКО.

Зьдзельшчына — агітатар за калектывізацыю

(Старобінскі р-н).

Калгасьнікі калгасу «Чырвоны Арацы» бальшавіцкімі тэмпамі працуюць над выкананьнем плянаў другой бальшавіцкай. Усе работы праводзяцца на асновах зьдзельшчыны.

У выніку ўдарнай работы калгасу, ў калгас ўзмацніўся прыліў беднаты і сераднякоў-аднаасобнікаў.

Да пачатку другой бальшавіцкай сяўбы калгас налічваў 8 гаспадарак, а зараз у калгас уступіла яшчэ 42 новых бядняцка-сераднякіх гаспадаркі.

Брыгада сельскораў «С. Б.»
М. Малочка.
А. Бяліцкі.

КОНКУРС УШЧЫЛЬНЯЕ ТЭРМІНЫ СЯЎБЫ

„Чырвоны партызан“ скончыў сяўбу з перавыкананьнем пляну

Калгасы Хойніцкага раёну—«Чырвоная Перамога», «Сталін», «Чырвоны Партызан», «Каапэратар» і «Камсамолец», абгаварыўшы пастанову ЦК КП(б)Б аб разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва, уключыліся ў конкурс барацьбы за пераходны сьцяг.

Галоўныя пункты ўмоў: поўнае выкананьне пляну, перавыкананьне пляну па тэхнічных культурах, пераход на зьдзельшчыну, датэрміновае скончэньне сяўбы.

На сёньня калгасы падыходзяць да скончэньня сяўбы. Плян выканан на 75—80 проц.

Калгас «Чырвоны Партызан» 22 мая закончыў ўсю сяўбу з перавыкананьнем пляну.

Брыгадзір «Сав. Беларусі» **В. С.**

Сяўба ў саўгасах праводзіцца па-ўдарнаму

Белсельгастрэст атрымлівае паведамленьні ад раду саўгасаў аб выкананьні перавыкананьні пляну сяўбы зярнёвых культур, асабліва аўсу.

Саўгас Цітва выканаў плян сяўбы па аўсу на 111 проц., Покрышава—121 проц., Рачкавічы—131 проц., Ціхінічы—102 проц., Крынкі—126 проц., Рагінь—126 проц.

Таксама поўнасьцю скончылі сяўбу аўсу саўгасы Станькава, Халопенічы, Анаполь, Стрэлічава і Брылеў.

Зьдзельшчына ўзьні мае працоўную дысцыпліну

У сувязі з пераходам калгасу Мальлеўскага сельсавету на зьдзельшчыну прадукцыйнасьць і ўкасьць работы значна падвысілася. Калі раней, у калгасе—«1-га мая» 1 га гною разьбівалі 4 жанчыны ў дзень то зараз гэту работу выконваюць 2-3 жанчыны. Раней вывазілася гною 9-10 вазоў, а пры пераходзе на зьдзельшчыну—вывозіцца 15-16 вазоў.

Калгасьнікі своячасова выходзяць на работу і працуюць ахвотна. Работа ў калгасах праходзіць па ўдарнаму. Калгасьнікі калгасу «Прамень Камуны № 2» у ліку 27 чалавек аб'явілі сябе ўдарнікамі імя «518» і «1040».

Бабруйскі раён.

Т.

Б'ем трывогу!

Дзякуючы адсутнасьці змазачных і гаручых матар'ялаў, дрэннага рамонту, трактары выходзяць з баразны, прастойваюць цэлымі тыднямі

Плешчаніцы. Сяўба па саўгасах і калгасах Плешчаніцкага раёну ў поўным разгары. Калгасы Амнітаўскага і Хатовіцкага сельсаветаў ужо заканчваюць засяваць ярыну.

Аднак, у пасьлядоўным правядзеньні сяўбы ёсьць яшчэ шмат недахопаў. Напрыклад, у саўгасах «Пятроліна» і «Замошша», дзе ёсьць 13 трактараў, наглядаецца няпоўная нагрузка трактароў. У саўгасе «Пятроліна» на працягу 5 дзён у часе сяўбы стаяла тры трактары, якія ня мелі гаручага.

Па калгасах Крапскага сельсавету без работы стаіць звыш 10 трактараў таму, што яны недасталкова адрамантаваны. Сапсаваныя тры трактары стаяць без работы і ў калгасах Плешчаніцкага сельсавету. Для трактараў няма запасных частак і даводзіцца езьдзіць за 50-70 кілёмэтраў па іх закупцы. Наглядаюцца зусім нядбайныя адносіны да трактараў з боку калгасаў і трактарыстаў, што спрыяе хутчэйшаму псаваньню трактароў.

А. З—кі.

Малатарня, якая патрабуе ўвагі РСІ

У Дуддзіцкім калгасе, Пухавіцкага раёну, да гэтага часу стаіць пад адкрытым небам складаная малатарня Харкаўскага заводу «Молат». Стаіць яна пад дажджом усю весну.

Як відаць, у такім становішчы малатарня застанецца і надалей, бо зараз яна, бачыце, «непатрэбна»: ніхто не клапоціцца, каб захаваць малатарню тым больш, што яна ўзята пазычкова ад калгасу «Замосьце», які таксама ня цікавіцца, у якім становішчы знаходзіцца малатарня і чаму яна ня зьвернута да гэтага часу.

Трэба прыцягнуць да адказнасьці праўленьні абодвых калгасаў за нядбайныя адносіны да складаных с.-г. машын.

К.

Лоеўскі раён па-ўдарнаму змагаецца за пераходны сьцяг

Лоеў. Лоеўскі раён выканаў дырэктыву партыі і ўраду аб 30 проц. калектывізацыі да вясны 1931 г.; На 15 мая раён калектывізаваны на 30,5 проц. ад агульнага ліку бядняцка-сераднякіх гаспадарак. Пры чым, першая дэкада мая дала калгасны прыліў каля 200 бядняцка-сераднякіх гаспадарак.

Пасадка бульбы (калгас «Інтэрнацыянал», Барысаўскі р.)

Лоеўскі раён уключыўся ў конкурс на лепшую арганізацыю веснавой сяўбы і калгаснага прыліву. Створан райштаб па кіраўніцтву гэтай работай; сельсаветы заключылі паміж сабою сац. дагавары на скарачэньне тэрмінаў сяўбы.

Райштаб.

28 мая а 12 гадзіне дню ў памяшканьні рэдакцыі (Пляц Волі) газэты „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ“

СКЛІКАЕЦЦА НАРАДА

па пытаньню жывёлагадоўлі і сьвінагадоўлі.

На нараду запрашаюцца прадстаўнікі наступных установаў і арганізацый: НКЗ, „Сьвінавод“ і Белсельбуд, Белсельтрэст, Цэнтральнай сьвінагадоўчай станцыі, Саюзу сьвінагадоўчых і жывёлагадоўчых саўгасаў і Малакацэнтру.

Спыніць злачынную блытаніну Саюзсадгародніны

Саюзсадгародніна праз увесь час разводзіць злачынную блытаніну па сваёй пэрыфэрыі, як у галіне будаўніцтва, так адгрузкі і ў інш. пытаньнях. На гэта ня раз паказвалася ў друку.

Апошні выпадак з боку Саюсадгародніны заслугоўвае асаблівай увагі цэнтральных установаў і вымушае ўзьняць гэтае пытаньне перад адпаведнымі органамі Саюзу, бо блытаніна Саюзсадгародніны адбіваецца на загатоўках.

У чым-жа тут справа? Вось у чым, 23 лютага пг. Саюзсадгародніна дала загад Белсадгароднінне наконт загатоўкі грыбоў і забясьпячэньня імі пралетарскіх цэнтраў. Для БССР вызначана кантрольная лічба на вываз 3300 тон грыбоў. Адгрузка гэтай колькасьці грыбоў разьмеркавана такім чынам: Маскве 2700 тон, Ленінграду 600 тон.

Белсадгароднінна спусьціла плян па раёнах і атрымала нават сустрэчныя пляны, на аснове чаго былі складзены кантрольныя лічбы вывазу ў параённым разрэзе і ўжо былі раёны паведамлены, куды яны павінны адгружаць грыбы.

Але-ж у палове сакавіка Саюзгароднінна дае новую ўстаноўку Белсадгароднінне: пераразьмеркаваць плян адгрузкі такім чынам, каб адгрузіць Маскве 1900 тон грыбоў, а Ленінграду 400 тон. Прышлося ламаць пляны і перамацоўваць раёны нанова. Аднак, праз некаторы час Саюзсадгароднінна дае трэцюю ўстаноўку: 12 мая яна загадвае адгрузіць Маскве 850 тон, Ленінграду 700 тон і Донбасу 750 тон.

Колькі яшчэ разоў Саюзсадгароднінна будзе даваць новыя ўстаноўкі па вывазе грыбоў? Гэтым пытаньнем павінны заняцца пракуратура і давесьці яго да ведама адпаведных органаў Саюзу, бо такая няталасьць з боку Саюзсадгароднінны можа стварыць прарыў у час загатовак.

Аксенчык.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

АФІЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ

Пра зьмену пастановы „Пра аўтарскае права"

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляе** зрабіць наступныя зьмены ў сваёй пастанове за 14 студзеня 1929 г. «Пра аўтарскае права». (З. З. БССР 1929 г., № 2, паст. 8);

1. Арт. 4 запісаць у наступнай рэдакцыі:

«4. У дагаворы не выданьне альбо на публічнае выкананьне павінна быць вызначана, на які тэрмін ён заключаецца, ганарар, тэрмін выданьня альбо публічнага выкананьня, тыраж альбо максымальны лік публічных выкананьняў.

Тэрмін дзейнасьці выдавецкага дагавору альбо дагавору на публічнае выкананьне ня можа быць больш двох гадоў».

2. Разьдзел «А». арт. 8 запісаць у наступнай рэдакцыі:

«А. За літаратурныя творы (з разьліку за адзін друкаваны аркуш):

а) хрэстаматыі—50 руб.;

б) лемантары — 90 руб.;

в) падручнікі для школ 1-га канцэнтру—100 руб., для 2-га канцэнтру, школ калгаснае моладзі, прафэсійных і савецка-партыйных школ, на масавую палітычную, навукова-папулярную і сельскагаспадарчую літаратуру —120 руб.;

г) мэтадычную літаратуру і падручнікі для тэхнікумаў і вышэйшых школ, а таксама за публіцыстычныя працы і за дзіцячую літаратуру — 150 руб.;

д) навукова-дасьледчыя працы і творы масткацкае прозы, бібліяграфіі і крытыкі—175 руб.;

е) драматычныя творы—200 руб.;

ж) вершы—30 кап. за радок.

Аплата перакладу ня можа быць меншаю 30 процантаў аплаты твору адпаведнае катэгорыі.

Пераклад вершаў аплачваецца па 25 кап. за радок».

3. Артыкул 11 запісаць у наступнай рэдакцыі:

«11. Аўтарскі ганарар, паказаны ў арт. 8 гэтае пастановы, вызначаецца за выданьне з тыражом ня больш:

а) для чытанак, ламантароў (для школ 1-га канцэнтру і школ дарослых), масавай палітычнай, навукова-папулярнай і сельскагаспадарчай літаратуры—50.000 экз.;

б) для правапісаў, граматык, падручнікаў па матэматыцы для 1-га канцэнтру працоўных школ—30.000 экз.;

в) для падручнікаў па прыродазнаўству, гэаграфіі і гісторыі для 1-га канцэнтру працоўных школ—25.000 экз.;

г) для падручнікаў працоўнае школы 2-га канцэнтру, для школ калгаснай моладзі, прафшкол, школ фабрычна-заводзкага вучнёўства, фабрычна-заводзкіх сямігодак і савецкіх партыйных школ 10.000 экз.;

д) для мэтадычнай літаратуры — 3.000 экз.;

е) для падручнікаў для вышэйшых школ—3.000 экз.;

ж) для падручнікаў для тэхнікумаў і рабфакаў—5.000 экз.;

е) для масткацкай прозы—3.000 экз.;

і) для вершаў — 2.000 экз.;

к) для драматычных твораў разьмерам да 2-х друкаваных аркушаў 2.000 экз.; для драматычных твораў разьмерам больш 2-х друкаваных аркушаў—1.000 экз.;

л) для музычных твораў—1.000 экз.;

м) для твораў навуковых, публіцыстычных, бібліяграфічных і крытычных—3.000 экз.;

н) для дзіцячай літаратуры—10.000 экз.;

о) для каляндароў—200.000 экз.;

п) для плякатаў—15.000 экз.;

Калі тыраж перавышае устаноўлены вышэй мінімум, дык аплата робіцца: за 2-е выданьне 50 проц. ад першага;

за 3-е выданьне 35 проц. ад першага;

за 4-е выданьне 20 ад першага;

і вышэй 5 проц. ад першага;

Аўтарскі ганарар за творы, паказаныя ў п. п. «а», «б», «в», «г» і «м», «н», «о», «п» на мовах нацыянальных меншасьцяў, вызначаецца за выданьні з тыражамі ў 50 проц. ад памянёнага вышэй».

4. Арт. 17 запісаць у наступнай рэдакцыі:

«17. Апроч атрыманьня разавога ганарару за перададзены відовішчнаму прадпрыемству твор для публічнага выкананьня, аўтар выдадзенага і нявыдадзенага твору атрымоўвае спэцыяльна аўтарскі ганарар за публічнае выкананьне, паводле наступных ставак:

а) за драматычныя арыгінальныя творы шэсьць проц. агульнага збору са спэктаклю;

б) за перакладзеныя драматычныя творы, незалежна ад таго, з якой і на якую мову яны перакладзены, два процанта агульнага збору са спэктаклю;

в) за лібрэта опэр і опэрэт і за пераклад іх — чатыры проц. агульнага збору са спэктаклю;

г) за музыку ў музычна-драматычных творах (опэры, опэрэты, балеты, пантамімы) і за балетную і панта мімную пастаноўку натыры проц. агульнага збору са спэктаклю для ўсіх аўтараў;

д) за музыку да п'ес, апроч паказаных у п. «г»—адзін проц. агульнага збору са спэктаклю;

е) за выкананьне на канцэртах музычных, вакальных і хорэаграфічных твораў, за дэклямаваньне (чытаньне) паэтычных альбо прозаічных твораў, а таксама паасобных частак гэтых твораў—тры проц. агульнага збору за ўсю праграму вечару для ўсіх аўтараў, творы якіх выконваюцца; за выкананьне гэтых твораў у кіно-тэатрах пяць проц. для ўсіх аўтараў з фактычнага заробку артыстаў за ўвесь вечар;

ж) за выкананьне твораў артыстамі эстрады, хорамі і аркэстрамі ў рэстаранах, сталоўках і ў іншых месцах, калі не бярэцца асобная плата за ўваход,—дзесяць проц. з агульнай сумы заробку, што належыць у гэты дзень (вечар) выканаўцам, для ўсіх аўтараў;

з) за музыку ў цырках, што выконваецца ў час цырковага паказу, калі яна спэцыяльна напісана для пэўных паказаў—адзін проц., а за зборную музыку—адна чвэрць проц. з валовага збору кожнага паказу, для ўсіх аўтараў; за музыку, сьпевы і дэклямацыю, што выконваюцца артыстамі — тры проц. з фактычнага заробку артыста за ўвесь дзень (вечар);

і) за публічнае выкананьне кінофільмаў — адзін проц. са збору за кожны сэанс для ўсіх аўтараў разам (аўтараў тэмы, лібрэта і сцэнарыя); калі плата з гледачоў не спаганяецца, дык пяць проц. з сумы, якая плаціцца за пракат фільму».

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **Грысевіч.**

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР **С. Кандыбовіч.**

1/ мая 1931 г.
г. Менск.

Пра работу дзіцячых дамоў

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Выслухаўшы даклад Народнага Камісарыяту Асьветы аб рабоце дзіцячых дамоў, Савет Народных Камісараў БССР адзначае, што ў рабоце дзіцячых дамоў ёсьць шэраг вялікіх прарываў: а) ў шэрагу месц дзённа вядзецца выхаваўчая работа, б) нагляда лася шэраг выпадкаў безгаспадарчасьці, в) да гэтага часу дзіцячыя дамы не падзелены па ўзроснаму прынцыпу, г) невылучаны з агульных дзіцячых дамоў дзеці хронікі, сухотныя і псіханэўротыкі, д) дзіцячыя дамы неўкамплектаваны адпаведнымі кадрамі, е) ня ўсе дзіцячыя дамы патрэбным чынам забясьпечваюцца харчамі, вопраткаю, пасьцельнаю і нацельнаю бялізнаю; ж) у многіх дзіцячых дамох дапушчаецца антысанітарнае становішча, з) не адрамантаваны і не абсталяваны памяшканьні для заняткаў, а таксама і для інтэрнатаў, і) майстэрні і гаспадаркі дзіцячых дамоў не забясьпечаны матарыялямі і прыладамі, к) вакол работы дзіцячых дамоў слаба згуртавана пралетарская грамадзкасьць.

Такое становішча дзіцячых дамоў тлумачыцца нядбайнымі адносінамі да гэтай справы органаў народнай асьветы, мясцовых савецкіх, каперацыйных і грамадзкіх арганізацый.

Выходзячы з гэтага, Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляе:**

1. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Асьветы не пазьней як праз месяц арганізаваць дзіцячыя дамы па ўзроснаму прынцыпу:

а) дашкольныя дзіцячыя дамы (4—7 гадоў);

б) школьныя дзіцячыя дамы I-га канцэнтру (8—11 гадоў);

в) школьныя дзіцячыя дамы II-га канцэнтру (12—15 гадоў);

г) дзіцячыя дамы для тых перагосткаў (12—15 гадоў), якія ня маюць ведаў за школу 1-й ступені.

Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Асьветы распрацаваць палажэньне аб дзіцячых дамох.

Вылучыць з дзіцячых дамоў дзяцей хронікаў; сухотных і псіханэўротыкаў у спэцыяльныя дамы.

2. Даручыць Народнаму Камісарыяту Асьветы, гарадзкім саветам і раённым выканаўчым камітэтам вывесьці з дзіцячых дамоў да чэрвеня месяца ўсіх перагосткаў, прапанаваўшы НКЗ, ВСНГ, Белсампрамсаюзу, Белкаапсаюзу, Белкалгасцэнтру і саўгастрэстам прыняць іх для работы на прадпрыемствах, у саўгасах і калгасах.

Прапанаваць гарадзкім саветам і раённым выканаўчым камітэтам даваць выхаванцам дзіцячых дамоў, якія перадаюцца Народным Камісарыятам Асьветы на вытворчасьць, кватэры ў першую чаргу, а Белжылсаюзу забясьпечыць ільготнае прыняцьцё гэтых перагосткаў пайнікамі ў ЖАКТ'ы.

Перагосткаў хворых і інвалідаў перадаць у адпаведныя ўстановы Народнага Камісарыята Аховы Здароўя і Народнага Камісарыята Сацыяльнага забясьпечаньня.

Даручыць Народнаму Камісарыяту Асьветы і Народнаму Камісарыяту Фінансаў прадугледзець з 1932 г. сродкі ў бюджэце на аднаразовую грашовую дапамогу перагосткам-выпускнікам з дзіцячых дамоў у разьмерах ня менш месячнага мінімуму і на забясьпечаньне поўным комплектам абмундыраваньня, пасьцельнай і нацельнай бялізны.

3. Прапанаць Народнаму Камісарыяту Асьветы не пазьней як праз месяц укамплектаваць дзіцячыя дамы адпаведнымі кадрамі, вылучыўшы на гэтую работу, ня менш 200 чалавек лепшых педагогаў.

Неадкладна вырашыць пытаньне аб плянавай падрыхтоўцы кадраў для дзіцячых дамоў праз тэхнікумы і інстытуты.

Даручыць Народнаму Камісарыяту Снабжэньня перагледзець не пазьней як праз 10 дзён устаноўленыя нормы харчоў для дзіцячых дамоў у бок іх павялічэньня, вылучыўшы для гэтай мэты спэцыяльныя цэнтралізаваныя фонды, праверяючы іх расходаваньне.

Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Снабжэньня, Белкаапсаюзу і Белсампрамсаюзу поўнасьцю без затрымкі забясьпечыць заяўкі дзіцячых дамоў на вопратку, пасьцельную і нацельную бялізну.

Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Снабжэньня, Белкаапсаюзу і Белдуперагледзець нормы выдаткаў, якія адпускаюцца на вопратку, пасьцельную і нацельную бялізну і абутак для выхаванцаў дзіцячых дамоў у бок іх павялічэньня з тым, каб грашовыя выдаткі забясьпечылі набыцьцё гэтых рэчаў паводле норм, зацьверджаных Народным Камісарыятам Снабжэньня СССР.

5. Прапанаваць гарадзкім саветам і раённым выканаўчым камітэтам ужыць неадкладна ўсе захады, каб на працягу гэтага будаўнічага сэзону адрамантаваць і абсталяваць памяшканьні дзіцячых дамоў для заняткаў, а таксама і для інтэрнатаў. Неадкладна палепшыць санітарнае становішча дзіцячых дамоў, адначасова наладзіўшы рэгулярнае мыцьцё бялізны і пропуск выхаванцаў дзіцячых дамоў праз лазьні.

6. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Асьветы, гарадзкім саветам і раённым выканаўчым камітэтам у самы кароткі час зрабіць рашучы пералом у пастаноўцы выхаваўчай работы дзіцячых дамоў, звярнуўшы пры гэтым асаблівую ўвагу на пастаноўку інтэрнацыянальна-клясавага і антырэлігійнага выхаваньня, а таксама на работу па палітэхнізацыі і самакіраваньні.

7. Для згуртаваньня вакол работы дзіцячых дамоў грамадзкасьці, прапанаваць Народнаму Камісарыяту Асьветы, Т-ваю «Прыхільнік дзяцей» гарадзкім саветам, раённым выканаўчым камітэтам, Белкалгасцэнтру, саўгаспрэстам разам з ЦСПСБ правесьці мерапрыемствы аб прынцыпі прадпрыемствамі, саўгасам, калгасамі, паасобнымі савецкімі ўстановамі і грамадзкімі арганізацыямі шэфства над дзіцячымі дамамі, паставіўшы задачаю шэфства ліквідацыю прарываў у рабоце дзіцячых дамоў і штодзённую дапамогу органам народнай асьветы ў наладжваньні арганізацыйнай, гаспадарчай і выхаваўчай работы.

8. У тых месцах, дзе ёсьць адпаведная палітычная база (прадпрыемства, саўгас, калгас) гаспадаркі дзіцячых дамоў перадаваць сумежным саўгасам і калгасам, прычым гаспадаркі павінны перадавацца ў кожным паасобным выпадку па пастанове Народнага Камісарыяту Асьветы і за паяўны разлікунак.

Сродкі за перададзены жывы і мёртвы інвэнтар скарыстаць на палепшаньне становішча данага дзіцячага дому.

Гаспадаркі дзіцячых дамоў, у раёне дзейнасьці якіх няма прадпрыемстваў, саўгасаў і калгасаў, пакінуць пры дзіцячых дамох, ужыўшы ўсе захады да іх узмацненьня, для чаго прапанаваць Народнаму Камісарыяту Земляробства і Белсельгаспнабу забясьпечыць патрэбу гэтых гаспадарак апранамічным кіраўніцтвам, сельскагаспадарчымі машынамі і прыладамі, насеньнем, унаенным і інш., наробкі з савецкіх гаспадаркамі.

Прапанаваць гарадзкім саветам і раённым выканаўчым камітэтам устанавіць спэцыяльны штат рабочых для вядзеньня гэтых гаспадарак. Выхаванцаў дзіцячых дамоў прыцягваць для работы ў гаспадарках, выходзячы толькі з вучэбна-выхаваўчых мэт.

9. Выслухаць у ліпені м-цы даклад Народнага Камісарыяту Асьветы аб выкананьні гэтай пастановы.

10. Для ліквідацыі недахопаў у рабоце дзіцячых дамоў і для прыцягненьня да гэтай важнейшай справы шырокай савецкай грамадзкасьці лічыць патрэбным прасьці з 1 чэрвеня да 1 ліпеня месячнік.

11. Для кіраваньня правядзеньнем месячніку ўтварыць пры Народным Камісарыяце Асьветы штаб з удзелам савецкіх, прафэсійных, гаспадарчых, каперацыйных і іншых грамадзкіх арганізацый.

Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Асьветы не пазьней як праз 3 дні падаць на зацьверджаньне Старшыні СНК персональны склад штабу.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Савету БССР **С. Кандыбовіч.**

22 мая 1931 г.
г. Менск.

Канцэрт у фонд будаўніцтва „Палаца мастацтва"

За апошні час канцэрты клясычнай музыкі, якія наладжваюцца Дзяржмузтэхнікуму БССР прыцягваюць увагу шырокіх мас слухачоў.

Адзін з такіх канцэртаў арганізуецца 27 мая г. г. у залі Дзяржмузтэхнікуму. У праграме канцэрту: Трэцьцяя сімфонія Бетховэна (Сімфанічны аркестр пад кіраўніцтвам тав. Гідгарца); трыо Чайкоўскага (Пятроў — рояль, Бясьмертны—скрыпка, Арлоў віолончэль); тарантэла Сьміта і Фіглер; «Габа» у выкананьні балярыны Белецкай; дуэт Джыльды і Рыголето муз. Вэрда выканае Несьцярэнко і Дзянісаў; Паганіны—Кампанэла і Зэфір-Гудая выканае Жыў (скрыпка): У рояля Жыў і Кляўс.

Увесь чысты збор паступіць у фонд будаўніцтва «Палацу Мастацтва».

Умовы

прыему на 6-цімесячныя курсы падрыхтоўкі раённага кіруючага партыйнага актыву пры ЦК КП(б)Б

1. У мэтах падрыхтоўкі кіруючых працаўнікоў Райкомаў КП(б)Б, пры ЦК КП(б)Б арганізуюцца з 1 чэрвеня 1931 г. 6-ці месячныя курсы на 150 асоб.

Курсы камплектуюцца 25 кіруючымі раённымі камсамольскімі працаўнікамі, 75 сакратарамі партячэек і 50-ю працаўнікамі савецка-гаспадарча-каапэрацыйных арганізацый.

2. На курсы прымаюцца таварышы па камандыроўках раённых партыйных камітэтаў, пры чым устанаўліваюцца наступныя умовы прыёму:

1) Партстаж камандыруемых павінен быць ня менш 3-х год (для кіруючых камсамольскіх працаўнікоў—ня менш 2-х год).

2) Апульнае і палітычнае развіцьцё ў аб'ёме вяч. Саўпартшколы.

3. Пры камплектаваньні курсаў павінна быць захаван такі склад іх, каб ня менш 70 проц. агульнай колькасьці слухачоў складаў рабочыя і батракі па сац. становішчу і ня менш 25 проц. жанчын.

4. Устанаўліваецца наступная раскладка па камплектаваньні курсаў Райпартактыву па раёнах (з правышэньнем 40 проц. звыш нормы для адбору).

НАЗВА РАЁНАЎ	Усяго	З іх па відах работ		
		Кам.	Пар.	Каап.-гасп.
Менскі	10	2	5	3
Гомельскі	10	2	5	3
Віцебскі	10	2	5	3
Магілеўскі	5	1	3	1
Аршанскі	4	1	2	1
Полацкі	3	1	1	1
Мазырскі	3	1	1	1
Бабруйскі	5	1	3	1
Барысаўскі	3	1	1	1
Усяго	53	12	26	15

Раёны: Дрыбінскі, Крупскі, Копыскі, Асіпавіцкі, Стара-Дароскі, Межынскі, Камарынскі, Чачэвіцкі, Чавускі, Азарыцкі, Капаткевіцкі, Лельчыцкі, Тураўскі, Юравіцкі, Грэскі, Асьвейскі, Расонскі і Дрысенскі камандыруюць на курсы на аднаму таварышу. Усе астатнія раёны камандыруюць на курсы 2 таварышоў (адзін з іх павінен быць абавязкова сакратаром буйнай партыйнай ячэйкі, або партколектыву).

5. Адбор курсантаў вытвараецца Райкомамі КП(б)Б і канчаткова выязднымі сэсіямі мандатнай камісіі, якія працуюць у наступных пунктах у нижэйпаказаныя тэрміны:

1. Менск 28 мая для т. т. камандыраён. б. Менскай і Бабруйскай акруг
2. Віцебск 30 „ „ „ „ б. Віцебскай і Полацкай акруг
3. Гомель 1 чэрвеня „ „ „ „ б. Гомельскай і Мазырскай акруг
4. Магілеў 3 „ „ „ „ б. Магілеўскай і Арш. акруг

6. Да 26 мая Райкомы КП(б)Б павінны абавязкова дасылаць хуткай поштай у Арганізацыйна-інструктарскі Аддзел ЦК КП(б)Б наступныя дакумэнты на камандыруемых на курсы: 1. Анкету, засьведчаную РК КП(б)Б, 2) Кароткі жыцьцяпіс і 3. Камандыроўку РК КП(б)Б.

7. Заняткі на курсах пачынаюцца 6 чэрвеня г. г. а 10 г. раніцы да якога тэрміну ўсе адабраныя камісіяй курсанты павінны зьявіцца ў ЦК КП(б)Б.

8. Слухачы курсаў на працягу усяго пэрыяду навучаньня забясьпечваюцца харчаваньнем, інтэрнатам, навучальнымі прыладамі і стыпэндыяй (хто не атрымлівае пэнсіі).

9. За ўсімі камандыруемымі таварышамі захоўваецца пэнсія па мейсцы іх працы.

Сакратар ЦК КП(б)Б **ГЕЙ.**

Т-ва „Прэч няпісьменнасьць"—на новы этап

(У парадку абгаварэньня)

Беларуская ССР, як і ўвесь СССР, надзвычайна блізка падышла да суцэльнай пісьменнасьці працоўных мас.

Зараз няпісьменных працоўных па БССР налічваецца 140.000, ліквідацыя няпісьменнасьці якіх павінна быць скончана, паводле пастаноў ураду і партыі, у 1931—32 навучальным годзе.

Т-ва «Прэч Няпісьменнасьць», як арганізацыя аб'ядноўчая сілы грамадзкасьці на барацьбу з няпісьменнасьцю, аказала значную дапамогу ў справе ліквідацыі няпісьменнасьці. Таму зараз, калі БССР шчыльна падышла да суцэльнай пісьменнасьці, т-ва «ПН» не павінна адмерці, спыніць свайго існаваньня, а прыняць іншую форму, атрымаць другі зьмест, набыць новую якасьць.

Не аб ліквідацыі т-ва павінна ісьці гутарка, а аб рэарганізацыі яго на аснове выкананьня задач у галіне культурнага будаўніцтва. Ужо зараз фактычна т-ва «ПН» ператвараецца ў т-ва «За Сацыялістычную Культуру». Пачынаецца перабудова і іншых дабраахвотных арганізацый і таварыстваў у зьвязку з перабудовай усёй нашай эканомікі.

У працэсе гэтай перабудовы, гэтай работы павінна адбыцца зьліжэньне сумежных таварыстваў, працуючых на культурным фронце. Адсюль відавочна мэтазгоднасьць іх злучэньня ў адзінае т-ва—за Сацыялістычную Культуру. Сюды павінны ўвайсьці т-ва «ПН», т-ва «Прыхільнік Дзяцей», Т-ва «Барацьбы з алкагалізмам», Т-ва «Прыхільнікаў Радыё», Т-ва «Тэхмас» і г. д.

Да рэарганізацыі т-ва «ПН» нельга падыйсьці мэханічна. Патрэбна знайсьці ў працэсе павышаных форм работы і яе мэтадаў—сацспаборніцтва і ўдарніцтва—мэтады перабудовы і злучэньня таварыстваў. Трэба знайсьці ў працэсе работы такую форму, якая павінна спрыяць актыўнасьці працоўных мас, арганізаваных у гэтае добраахвотнае т-ва.

Працуючы на грунце адзінага пляну з Саветамі Культурнага Будаўніцтва, дапамагаючы ім у справе мабілізацыі грамадзкасьці, гэта новае таварыства павінна адыграць актыўную ролю ў справе пасьпяховага вырашэньня ўсіх праблем культурнай рэвалюцыі.

Перабудова-ж работы т-ва «ПН», перабудова яе тварам да баявых задач сацыялістычнага будаўніцтва павінна ісьці ў асноўным па наступных лініях:

1. Ўсеагульнае навучаньне. Прарывы, якія маюцца на гэтым фронце тлумачацца тым, што ўсеагульнае навучаньне ў частны раёнаў ня стала масавым грамадзкім мерапрыемствам. Т-ва «ПН» павінна садзейнічаць прасоўваньню новых, ударных мэтадаў на фронце ўсеагульнага навучаньня.

2. Хуткае заканчэньне ліквідацыі няпісьменнасьці ставіць перад т-вам «ПН» задачу паступовага, але рашучага пераключэньня на хаду—ад ліквідацыі малапісьменнасьці. Патрэбна ня толькі навучыць грамаце, але працягнуць навучаньне далей. Ад ліквпункту—да 4-хгадовай школы для дарослых з спэцыяльнай праграмай, з пераключэньнем на бесперапынны вучэбны год.

3. Барацьба з рэцыдывам, барацьба са зваротам да няпісьменнасьці павінна быць вырашана шляхам павышэньня якасьці навучаньня грамаце, належнага ўсваеньня вучэбнага матар'ялу, прывіцьця навыкаў самастойнае работы з кніжкай і газэтай, уменьня карыстацца імі, уцягваньня скончаўшых ліквпункты ў актыўную грамадзкую работу, прыцягненьня іх у школы дарослых і г. д.

4. Асноўная задача кожнага ліквпукту—прыцягнуць усіх навучаючыхся ў іх да сацыялістычнага будаўніцтва, выхаваць з іх сьвядомых і актыўных удзельнікаў гэтага будаўніцтва. Адсюль выплывае неабходнасьць падпарадкаваньня ўсяго навучаньня ў школах малапісьменных і ліквпунктах тым палітычна-гаспадарчым мерапрыемствам, якія праводзяцца партыяй і ўрадам. Школы граматы павінны быць ператвораны ў школу будаўнікоў сацыялізму, у школу кадраў для гэтага будаўніцтва.

Усе гэтыя задачы рэарганізаванае т-ва «ПН» зможа выканаць толькі пры ўмове пралетарызацыі т-ва, уцягненьня рабочых-ударнікаў у рады т-ва, рабочых МТС, саўгасаў, калгасьнікаў, батракоў, беднякоў і сераднякоў, павялічэньня партыйна-камсамольскага асяродзьдзя ў т-ве, максымальнага разгортваньня саспаборніцтва і ўдарніцтва, жорсткай бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі, рашучай барацьбы з усімі недахопамі на культурным фронце.

ХМЯЛЕЎСКІ.

ПА БССР

5 цэнтнэраў масла чакае адпраўкі

Загатоўка малочных прадуктаў для пралетарскіх цэнтраў зьяўляецца баявой задачай. На сёньняшні дзень па Вушацкім раёне ідзе ўзмоцненая эдача малака на зьлівачныя пункты. Аднак, перапрацоўка яго пастаўлена з рук вон дрэнна. Праўленьне райсаюзу тлумачыць гэта аб'ектыўнымі прычынамі: адсутнасьцю спэцыялістаў, прыклад і інш.

На сёньняшні дзень ляжыць пяць цэнтнэраў масла і нікуды не адпраўляецца. Райсаюз і тут знайшоў прычыны: няма ў чым везьці. Пры некаторых калгасах ёсьць майстэрні, але гэтая маглівасьць не выкарыстоўваецца для таго, каб забясьпечыць тараю адпраўку масла.

Райсаюз чакае, пакуль Белкаапсаюз даставіць яму тару і адгрузіць за яго масла.

Ю. Росны.

Два розных узоры адгрузкі

Вушацкаму райкаапсаюзу дан нарад адгрузіць 64 тоны бульбы, але дзяжуючы праваапартуністычнай бязьдзейнасьці яго на сёньняшні дзень адгружана толькі 14 тон. Ніякіх мер для выкананьня пляну ня прынята.

У гэты-ж час райспажыўсаюз дадзенае заданьне па адгрузцы бульбы выканаў на 90 проц. Гэта сьведчыць аб тым, што райспажыўсаюз пабальшавіцку узяўся за адгрузку бульбы, а райкаапсаюз адгрузку бульбы сарваў. Адпаведныя органы павінны пакараць вінаватых.

Брыгада «С. Б.»: **Каропік Ул., Грыдзюшка М.**

***

Калгас «Росквіт», Боркавіцкага раёну, які пасьпяхова праводзіць веснавую сяўбу на аснове зьдзельнічыны, займае адно з першых месц сярод калгасаў раёну. Калгас штодня павялічваецца за кошт бядняцкіх і сераднякіх гаспадарак.

Селькор.

АПАВЯШЧЭНЬНЕ

26-5, а 7 гадз. увеч. у Доме Асьветы, адбудзецца агульна-гарадзкі сход усіх асьветнікаў г. Менску па пытаньні правядзеньня рэйду ўдарных брыгад газэты «Сав. Беларусь». «За Ком. Просвещение» і Ц. П. Белпрацасьветы.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ЦЫРК-КІНО-ТЭАТР

Яўрэйскі Дзяржтэатр Украіны — Сёньня адчынены спэктакль **КАДРЫ** Пач. а 8 г. Білеты прад. ў раб. касе з 12—2 г. і з 4—6 г.

Дзяржцырк — Сёньня і штодзённа **ВЯЛІКІ ЦЫРКАВЫ ПАКАЗ** Пачат. а 8 з пал. гадз. увечары. Льготныя білеты ў рабкасе

„Чырвоная Зорка" — **2 фільмы МІРАБО**— Драма ў 6 частках. за адзін сэанс. **СТАРОНКА З БІОГРАФІІ** у 2 част. Пач. а 7, 8 45, 10 30 г. Каса адч. з 5 гадз.

Кіно-тэатр „Культура" — Новы мастацкі фільм **Лётнік і дзяўчына** драма ў 6 частках. Звыш праграмы кіно-хроніка Саюзкіно № 23 Пачат. а 7, 8 45 г., 10 30 г. Каса адч. з 5 г

Кіно ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ — Замежны фільм **Баязьлівец** Звыш праграмы кіно-хроніка Саюзкіно № 22 Пачатак а 7 гадзіне ўвечары.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ" — **ГЭТА МОЙ ЖАНІХ** комэдыя ў 7 частк. Пачатак а 7 гадзіне

Кіно „Юны Піянэр" — **Пат і Паташон на моры** арыгінальная камэдыя ў 2 частках. Звыш праграмы—часопіс № 7.

БЕЛАРУСКАМУ ЛЁНАКАНАПЛЕВОДСАЮЗУ (Савецкая, 46)

ПАТРАБУЮЦЦА

2 БУХГАЛЬТАРЫ, 2 МАШЫНІСТКІ І 2 СТАТЫСТЫКІ.

Жадаючых заняць гэтыя пасады просяць зварочвацца да сакратара праўленьня т. Прэабражэнскага.

ДАВОДЗІЦЦА ДА ВЕДАМА

ЎСІХ ЧЛЕНАЎ І КАНДЫДАТАЎ ГАРСАВЕТУ,

ЯКІЯ ДА ГЭТАГА ЧАСУ НЕ АТРЫМАЛІ

сталых сяброўскіх білетаў (мандатаў),

ШТО ПЕРАМЕНА ЧАСОВЫХ СЯБРОЎСКІХ БІЛЕТАЎ

ВЫТВАРАЕЦЦА

ў Гарсавеце штодзённа ад 9 да 15 гадз. да 1 чэрвеня 31 г.

Выданыя Гарсаветам часовыя білеты маюць моц толькі да 1-га чэрвеня г. г.

Сакратар Гарсавету ШАЛКАВЕЦ.

Вучэбнаму Камбінату ст. Ворша МБЛ чыгункі

ПАТРЭБЕН —)АДЗІН(— **ВОПЫТНЫ РАХУНКАВОД,**

знакомы з фінансавай справай, пэнсія 115 р. у м-ц;

І АДЗІН БІБЛІАТЭКАР з пэнсіяй 110 руб. у месяц.

ПАСАДЫ ШТАТНЫЯ і карыстаюцца ПРАВАМ ЧЫГУНАЧНІКА

ШКЛОЗАВОД „ТРУДЫ"

пры станцыі Дрэтунь МБЛ чыгункі

ЛІКВІДУЕЦЦА

УСЕ ПРЭТЭНЗІІ ДА ЗАВОДУ ПРАДЪЯЎЛЯЮЦЬ ЛІКВІДКОМУ ЗАВОДУ ДА 1 ЛІПЕНЯ 1931 Г.

Пасьля вызначанага тэрміну прэтэнзіі будуць лічыцца несапраўднымі

Старшыня ліквідкому ЖИГАЎ.

КАЛЯНДАРНЫ ПЛЯН

перавыбарчых сходаў па выбарам дэпутатаў у Менскі Гарадзкі Савет Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў па тым выбарчым вучасткам, дзе перавыбарчыя сходы не адбыліся

№№ п-ч.	Назва ўстаноў і прадпрыемстваў	Час сходу	Месца сходу	Упаўнаважаны выбарчай камісіі
	На 28 мая			
1	Утрыманцы рабочых і служачых заводу імя Варашылава	7	Клюб мэтэлістаў	Беркоўскі
2	Утрыманцы членаў саюзу мэдсанпрацы	7	„ гарсавету	Нісенбаум
3	Утрыманцы членаў саюзу камунальнікаў	7	„ камунальнікаў	Пінхасік
4	Утрыманцы членаў саюзу: земляробч га, жывёлагадоўчага, мацыпа-трактар. і батрацтва	7	Дом калгасьніка	Якубовіч
5	Утрыманцы каапэрыраваных саматужнікаў, аб'яднаемых прамысловакаапэрацыйнымі арцелямі	7	Клюб саматужнікаў	Эльперын
	На 30 мая			
6	Утрыманцы рабочых і служачых скарняжнай ф-кі, швэйнай лябараторыі, фабзавуча, швэйнаб'яднаньня, гаргрупкому швэйнікаў, ф-кі імя 8 сакавіка, ф-кі імя Крупскай і членаў саюзу тэ стыльшчыкаў	7	Чырвоны куток ф-кі „Кастрычнік", (Ленінская, 14).	Беркоўскі
7	Утрыманцы члена" саюзу хэмікаў	7	Клюб камунальнік.	Млодак
8	Утрыманцы рабочых і служачых заводу Полымя Рэвалюцыі і Белмэтальаб'яднаньня	7	„ Ільліча	Арлоў
9	Неарганізаванае насельніцтва, пражываюе ў 1 і 3 аддз. міліцыі і ўтрыманцы інвалідаў страхкасы	7	„ Гарсавету	Дзічкоўскі
10	Утрыманцы рабочых і служачых ф-кі „Беларуска" і астатніх членаў саюзу дрэваапрацоўшчыкаў апрача ўтрыманцаў заводу „Дрэваапрацоўшчык"	7	„ Эльводу	Шалкавец

Менская гарадзкая выбарчая камісія.

Нарсуд Чэрыкаўскага раёну, на падставе прысуду, ад 29-га сакавіка г. г. па арт. 196 і 1-й 213 КК абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне крамніку Чэрыкаўскага ГарПО Санкоўскай Аўдоцьці Сяргеўне за выдачу дыфіцытных тавараў служачым ЕПО без заборных кніжак, протэкцыонізм.

Нарсуд Чэрыкаўскага раёну, на падставе прысуду ад 29-га сакавіка г. г. па арт. 196 і 213 КК, б. загадчыку крамы Цэнтрасыпірту г. Чэрыкава тав. Рыськіну Х. І., за нядбайныя адносіны к сваім службовым абавязкам абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне.

Нарсуд Чырвонапольскага раёну, на падставе прысуду ад 30-га сакавіка г. г. па арт. 196—213 КК, за несвоячасовае прыняцьце крокаў па спагнаньні запазычанасьці Чырвонапольскаму с. г. т-ву абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне б. старшыне Краснапольскага с. г. т-ва Васілеўскаму Саўку Міхасеву.

Нарсуд Краснапольскага раёну, на падставе прысуду ад 31-га сакавіка г. г. па арт. 196 і 213 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне за нядбайныя адносіны да аховы леса б. лесьніку Чырвонапольскага лясьніцтва Чарткову Рыгору Яўхімаву.

Барава-Будзкі сельсавет, Кармянскага раёну, паведамляе, што ад гр-на Краўцова Піліпа Ільліча жых. в. Барава-Буда паступіла заява аб зьмене прозьвішча «Краўцоў» на прозьвішча «Дышанаў».

Асоб, якія маюць пратэст супроць зьмены прозьвішча Краўцова просьба паведаміць аб гэтым Барава-Будзкі сельсавет, паказаўшы свае прозьвішча імя, імя па бацьку і адрас.

Нарсуд Крупскага раёну, на падставе прысуду ад 28-га сакавіка г. г., абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне быўш. прыказчыку Ухвальскай каапэрацыі Цагліку Аляксею Янову, за нядбайныя адносіны да работы, якія зьмяшчаюцца ў тым, што ён пакінуў адчыненую стаўню ў краме Ухвальскай каапэрацыі, дзякуючы чаму ў ноч на 10-XII-30 г. у краму пыталіся пранікнуць злачынцы для учыненьня крадзяжу.

Нарсуд Чачэрскага раёну, на падставе прысуду ад 1-га лютага г. г. па арт. 197—213 КК за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў і за лаянку гр. Кандрацьцева — абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне старшаму міліцыянэру Чачэ